**XVI ЗВЫЧАЙНАЯ ГЕНЕРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ**

**СІНОДА БІСКУПАЎ**

**Першая сесія**

**(4–29 кастрычніка 2023 года)**

***Падагульняючая справаздача***

# СІНАДАЛЬНЫ КАСЦЁЛ У МІСІІ

*Пераклад з англійскай мовы*

**28 кастрычніка 2023 года**

# УВОДЗІНЫ

Дарагія сёстры, дарагія браты!

«Бо ўсе мы ў адным Духу ахрышчаныя ў адно цела» (1 Кар 12, 13). Гэта той вопыт, поўны радасці і ўдзячнасці, які мы атрымалі падчас гэтай першай сесіі сінадальнай асамблеі, што праводзілася з 4 па 29 кастрычніка 2023 г. на тэму “На карысць Касцёла сінадальнага: камунія, удзел, місія”. Нягледзячы на разнастайнасць гісторый, моў і культур дзякуючы супольнай ласцы хросту мы змаглі перажыць гэтыя дні разам, адзіныя сэрцам і духам. Мы стараліся спяваць, як хор, калі многія галасы як бы даюць выраз адзінай душы. Дух Святы адарыў нас вопытам той гармоніі, якую адзін Ён можа стварыць; гэта дар і сведчанне ў свеце, які раздзіраецца падзеламі.

Нашая асамблея адбывалася ў той час, калі ў свеце бушавалі старыя і новыя войны, што нясуць драматычныя наступствы для незлічоных ахвяр. Сярод нас раздаваўся крык убогіх, тых, хто вымушаны мігрыраваць, і тых, хто зносіць насілле і спусташальныя наступствы змены клімату. Мы чулі іхні крык не толькі праз СМК, але і дзякуючы галасам многіх прысутных, асабіста ўключаных у гэтыя трагічныя падзеі як члены пацярпелых сямей ці народаў. Мы ва ўсе часы прымалі гэты крык да сэрца, уключалі яго ў свае малітвы, задаючы пытанне, якім чынам нашыя Касцёлы могуць паспрыяць шляхам прымірэння, надзеі, справядлівасці і спакою.

Наша сустрэча адбывалася ў Рыме, вакол наступніка Пятра, які ўмацоўваў нас у нашай веры і заахвочваў нас быць адважнымі ў сваёй місіі. Мы мелі ласку распачаць гэтыя дні экуменічным чуваннем, якое пабачыла лідараў і прадстаўнікоў іншых Касцёлаў і хрысціянскіх супольнасцей, якія маліліся разам з Папам пры магіле Пятра. У святым Божым Касцёле ціха зараджалася еднасць; мы бачылі яе на свае ўласныя вочы, і, поўныя радасці, даём сведчанне аб гэтым. “Як жа добра і прыемна, калі браты жывуць разам” (Пс 133, 1).

Па распараджэнні Святога Айца на асамблеі разам з біскупамі і вакол іх сабраліся іншыя члены Божага народу. Біскупы, з’яднаныя паміж сабой і з біскупам Рыма, паказалі Касцёл як супольнасць Касцёлаў. Свецкія, манаскія асобы, дыяканы і прэзбітэры былі разам з біскупамі сведкамі працэсу, які мае на мэце ахапіць увесь Касцёл і ўсіх у Касцёле. Іх прысутнасць нагадала нам, што асамблея з’яўляецца не ізаляванай падзеяй, а неад’емнай часткай і неабходным крокам у сінадальным працэсе. Мноства выступленняў і разнастайнасць пазіцый, агучаных на асамблеі, паказалі Касцёл, які вучыцца прымаць сінадальны стыль і шукае найбольш прыдатныя шляхі для гэтага.

Прайшло больш за два гады з таго часу, як мы пачалі шлях, які прывёў нас да гэтай сесіі. Пасля пачатку сінадальнага працэсу 9 кастрычніка 2021 г. усе Касцёлы, хаця і рознымі тэмпамі, уключыліся ў працэс слухання на дыяцэзіяльным, нацыянальным і кантынентальным этапах, вынікі чаго былі зафіксаваны ў адпаведных дакументах. Гэтая сесія адкрыла этап, на якім увесь Касцёл прыняў плёны гэтай кансультацыі, каб у малітве і дыялогу распазнаць шляхі, якімі заклікае нас існі Дух. Гэты этап будзе доўжыцца да кастрычніка 2024 г., калі другая сесія асамблеі завершыць сваю працу, прапанаваўшы яе Святому Айцу.

Увесь гэты шлях, укаранёны ў Традыцыі Касцёла, праходзіць у святле саборнага навучання. Другі Ватыканскі сабор быў насамрэч нібы зернем, пасеяным на полі свету і Касцёла. Глебай, на якой яно прарастала і расло, з’яўлялася штодзённае жыццё вернікаў, вопыт Касцёлаў кожнага народа і культуры, шматлікія сведчанні святасці і разважанні

тэолагаў. Сінод 2021–2024 гг. працягвае чэрпаць энергію гэтага зерня і развіваць яго патэнцыял. Сінадальны шлях, па сутнасці, з'яўляецца ажыццяўленнем таго, чаму сабор навучаў пра Касцёл як Таямніцу і Божы народ, пакліканы да святасці. Ён шануе ўклад усіх ахрышчаных, зроблены ў адпаведнасці з іх пакліканнем, каб дапамагчы нам лепш разумець і практыкаваць Евангелле. У гэтым сэнсе гэта сапраўдны акт далейшага прыняцця сабору, які прадаўжае яго натхненне і аднаўляе яго прароцкую сілу для сучаснага свету.

Пасля месяца працы Пан заклікае нас вярнуцца ў нашыя Касцёлы, каб перадаць усім вам плён нашай працы і працягваць шлях разам. Тут, у Рыме, нас было няшмат, але мэта сінадальнага шляху, як яе назваў Святы Айцец, гэта задзейнічаць усіх ахрышчаных. Мы горача жадаем, каб гэта адбылося, і прысвячаем сябе таму, каб гэта стала магчымым. У гэтай падагульняючай справаздачы мы сабралі асноўныя элементы, якія ўзніклі ў дыялогу, малітве і дыскусіі, што характарызавалі гэтыя дні. Нашы асабістыя гісторыі ўзбагацяць гэтае падсумаванне зместам пеpажытага вопыту, які ні адзін дакумент не можа перадаць належным чынам. Тым самым мы зможам сведчыць пра багацце нашага вопыту слухання, маўчання і дзялення, а таксама малітвы. Мы падзелімся тым, што няпроста выслухоўваць розныя ідэі, не паддаючыся адразу спакусе супрацьстаяць выказаным поглядам, або прапанаваць свой уклад як дар для іншых, а не як нешта абсалютнае ці пэўнае. Аднак ласка Пана дазволіла нам дасягнуць гэтага нягледзячы на нашыя абмежаванні, і гэта было для нас сапраўдным вопытам сінадальнасці. Практыкуючы яе, мы лепш зразумелі яе і ацанілі яе каштоўнасць.

Насамрэч мы зразумелі, што ісці разам як ахрышчаныя, у разнастайнасці харызмаў, пакліканняў і служэнняў, важна не толькі для нашых супольнасцяў, але і для ўсяго свету. Евангельская салідарнасць падобная да светача, які трэба ставіць не пад пасудзіну, але на свечнік, каб ён асвятляў увесь дом (пар. Мц 5, 15). Сёння свет мае патрэбу ў гэтым сведчанні як ніколі. Як вучні Езуса мы не можам ухіляцца ад адказнасці дэманстраваць і перадаваць любоў і пяшчоту Бога параненаму чалавецтву.

Праца гэтай сесіі вялася ў адпаведнасці з «дарожнай картай», закладзенай у працоўным дакуменце (*instrumentum laboris*), з дапамогай якой асамблея магла разважаць над характэрнымі прыкметамі сінадальнага Касцёла і дынамікай камуніі, місіі і ўдзелу, якія ён змяшчае. Мы змаглі абмеркаваць сутнасць пытанняў, вызначыць тэмы, якія патрабуюць паглыбленага вывучэння, і вылучыць папярэдні набор прапаноў. У святле дасягнутага прагрэсу падагульняючая справаздача не паўтарае ўсяго зместу працоўнага дакумента; хутчэй яна надае новы імпульс тым пытанням і тэмам, якія мы палічылі прыярытэтнымі. Гэта не канчатковы дакумент, а інструмент на службе пастаяннага распазнання.

Падагульняючая справаздача складаецца з трох частак. Першая акрэслівае «аблічча сінадальнага Касцёла», прадстаўляючы практыку і разуменне сінадальнасці і яе тэалагічную аснову. Тут яна прадстаўлена перш за ўсё як духоўны вопыт, які вынікае з сузірання Тройцы і раскрываецца праз спалучэнне адзінства і разнастайнасці ў Касцёле. Другая частка пад назвай «Усе вучні, усе місіянеры» датычыцца ўсіх удзельнікаў жыцця і місіі Касцёла і іх адносін паміж сабой. У гэтай частцы сінадальнасць прадстаўлена галоўным чынам як сумеснае падарожжа Божага народа і як плённы дыялог паміж харызмамі і служэннем на службе прыйсця Валадарства. Трэцяя частка носіць назву «Тканне сувязяў, будаванне супольнасці». Тут сінадальнасць прадстаўлена галоўным чынам як набор працэсаў і як сетка органаў, якія дазваляюць абмен паміж Касцёламі і дыялог са светам.

У кожнай з трох частак у асобных раздзелах сабраны агульныя пункты погляду, пытанні для разгляду і прапановы, якія ўзніклі ў выніку дыялогу. Пункты згоды вызначаюць

пэўныя кропкі, якія арыентуюць рэфлексію, падобна карце, якая дапамагае знайсці шлях. Пытанні для разгляду абагульняюць моманты, адносна якіх неабходна працягваць паглыбляць наша разуменне ў пастырскім, тэалагічным і кананічным плане. Гэта як на скрыжаванні, дзе трэба спыніцца, каб лепш зразумець, у якім напрамку трэба рухацца. У прапановах пазначаны магчымыя шляхі, якімі можна пайсці. Некаторыя з іх мы прапаноўваем, іншыя рэкамендуем, трэціх жа мы патрабуем з пэўнай сілай і рашучасцю.

У бліжэйшыя месяцы Канферэнцыі біскупаў і іерархічныя структуры Усходніх Каталіцкіх Касцёлаў, якія з'яўляюцца сувязным звяном паміж мясцовымі Касцёламі і генеральным сакратарыятам сінода, будуць адыгрываць важную ролю ў развіцці нашых разважанняў. Зыходзячы з ужо дасягнутых пунктаў згоды яны закліканы засяродзіцца на пытаннях і прапановах, якія палічаць найбольш актуальнымі. Мы просім іх заахвочваць вывучэнне гэтых пытанняў як з пастырскага, так і з тэалагічнага пункту гледжання, а таксама ўказваць іх кананічныя наступствы.

Мы носім у сваіх сэрцах жаданне, падмацаванае надзеяй, каб клімат узаемнага слухання і шчырага дыялогу, які мы перажылі падчас дзён супольнай працы ў Рыме, выпраменьваўся ў нашых супольнасцях і ва ўсім свеце на карысць росту добрага зерня Божага Валадарства.

# ЧАСТКА I — АБЛІЧЧА СІНАДАЛЬНАГА КАСЦЁЛА

## 1. Сінадальнасць: вопыт і разуменне

**Агульныя пункты погляду**

a) Мы прынялі запрашэнне з новым усведамленнем прызнаць сінадальны аспект Касцёла. Сінадальная практыка была засведчана ў Новым Запавеце і ў раннім Касцёле і набывала канкрэтныя гістарычныя формы ў розных Касцёлах і традыцыях. Другі Ватыканскі сабор «абнавіў» гэтую практыку, і Папа Францішак чарговы раз заахвоціў Касцёл да яе аднаўлення. Сінод 2021–2024 гг. з'яўляецца часткай гэтага аднаўлення. Праз яго святы Божы народ адкрыў, што сінадальны спосаб маўчання, малітвы, слухання і размовы, укаранёны ў Божым слове і ў радасных, хоць часам і балючых, сустрэчах, вядзе да больш глыбокага ўсведамлення таго, што ўсе мы браты і сёстры ў Хрысце. Неацэнным плёнам гэтага працэсу з’яўляецца ўзмоцненае ўсведамленне нашай ідэнтычнасці як вернага Божага народа, у якім кожны з’яўляецца носьбітам годнасці, што вынікае з хросту, і кожны пакліканы да дыферэнцыраванай суадказнасці за супольную місію евангелізацыі.

b) Гэты працэс аднавіў наш вопыт і жаданне Касцёла як Божага дома і сям’і, Касцёла, бліжэйшага да жыцця сваіх людзей, менш бюракратычнага і больш сувязнага. З гэтымі вопытам і жаданнем былі звязаны тэрміны «сінадальны» і «сінадальнасць»: яны прапанавалі разуменне, якое цяпер патрабуе далейшага тлумачэння. Гэта той Касцёл, пра жаданне якога маладыя людзі заявілі ўпершыню ў 2018 г. падчас сінода моладзі.

c) Тое, што асамблея адбывалася ў зале Паўла VI, у тым ліку сядзенне людзей невялікімі групамі за круглымі сталамі, для некаторых культур было падобна да біблійнага вобразу вясельнай гасціны (Ап 19, 9). Гэта разумелася як сімвал сінадальнага спосабу існавання Касцёла і вобраз Эўхарыстыі, якая з’яўляецца крыніцай і вяршыняй сінадальнасці з Божым словам у цэнтры. У Касцёле, які жыве сінадальна, розныя культуры, мовы, абрады, спосабы мыслення і рэчаіснасці могуць разам і плённа ўдзельнічаць у шчырым пошуку кіраўніцтва Духа.

d) Сярод нас былі сёстры і браты з народаў, якія пацярпелі ад вайны, пакутніцтва, пераследу і голаду. Цяжкае становішча іх народаў, якія часта не маглі ўдзельнічаць у сінадальным працэсе, тым не менш увайшло ў цыкл нашых дыскусій і малітваў, паглыбляючы наша пачуццё еднасці з імі і нашу рашучасць быць міратворцамі.

e) Асамблея часта казала пра надзею, аздараўленне, прымірэнне і аднаўленне даверу сярод шматлікіх дароў, якія Дух выліў на Касцёл падчас гэтага сінадальнага працэсу. Адкрытасць да слухання і суправаджэння ўсіх, у тым ліку тых, хто пацярпеў ад злоўжыванняў і крыўд у Касцёле, зрабіла бачнымі многіх, хто доўгі час адчуваў сябе нябачным. Доўгі шлях да прымірэння і справядлівасці, у тым ліку прыняцце мер адносна структурных прычын, якія спрыялі такім злоўжыванням, застаецца перад намі і патрабуе канкрэтных жэстаў пакаяння.

f) Мы ведаем, што «сінадальнасць» – гэта тэрмін, незнаёмы многім членам Божага народа, які выклікае ў некаторых людзей блытаніну і заклапочанасць. Сярод выказаных страхаў ёсць тое, што вучэнне Касцёла будзе зменена, што прывядзе да таго, што мы адступім ад апостальскай веры нашых продкаў і, такім чынам, не зможам адказаць на патрэбы тых, хто сёння шукае і прагне Бога. Аднак мы ўпэўненыя, што сінадальнасць з’яўляецца выразам дынамічнай і жывой Традыцыі.

g) Не адмаўляючы важнасці прадстаўнічай дэмакратыі, Папа Францішак адказвае на занепакоенасць, якую выказваюць некаторыя, што сінод можа стаць органам большасці, пазбаўленым свайго эклезіяльнага і духоўнага характару, што паставіць пад пагрозу

іерархічную прыроду Касцёла. Відавочна, некаторыя людзі баяцца, што іх прымусяць змяніцца; іншыя баяцца, што ўвогуле нічога не зменіцца або што будзе занадта мала мужнасці, каб рухацца ў тэмпе жывой Традыцыі. Акрамя таго, разгубленасць і супраціўленне часам могуць хаваць страх страціць уладу і прывілеі, якія з яе вынікаюць. Аднак ва ўсіх культурных кантэкстах тэрміны «сінадальны» і «сінадальнасць» гавораць пра спосаб быцця Касцёлам, які аб'ядноўвае камунію, місію і ўдзел. Прыкладам можа служыць Касцёльная канферэнцыя Амазоніі (CEAMA) – плён місійнага сінадальнага працэсу ў рэгіёне.

h) У самым шырокім сэнсе сінадальнасць можна разумець як тое, што хрысціяне ідуць у еднасці з Хрыстом да Валадарства разам з усім чалавецтвам. Яе арыентацыя накіравана на місію, а яе практыка ўключае ў сябе асамблеі на ўсіх узроўнях касцельнага жыцця. Яна складаецца з узаемнага слухання, дыялогу, супольнага распазнавання і выпрацоўкі кансэнсусу як выразу, які робіць Хрыста прысутным у Духу Святым; прытым кожны прымае рашэнні ў адпаведнасці са сваімі абавязкамі.

i) Дзякуючы вопыту і сустрэчам мы выраслі разам у гэтым усведамленні. Падвядзём вынік. З першых сваіх дзён асамблея выявіла, што фарміруецца двума перакананнямі: першае – што вопыт, якім мы дзяліліся за гэтыя гады, з'яўляецца сапраўды хрысціянскім і павінен быць прыняты ва ўсім яго багацці і глыбіні; другое – што тэрміны «сінадальны» і «сінадальнасць» патрабуюць больш дакладнага паяснення свайго значэння ў розных культурах. Узнікла сутнасная згода, што – з улікам неабходных удакладненняў – сінадальнасць прадстаўляе сабою будучыню Касцёла.

**Пытанні для разгляду**

j) Існуе неабходнасць, абапіраючыся на ўжо распачатую рэфлексіўную працу, удакладніць значэнне сінадальнасці на розных узроўнях у пастырскім, тэалагічным і кананічным плане. Гэта дапаможа прадухіліць рызыку таго, што паняцце будзе гучаць занадта расплывіста ці агульна або будзе выглядаць як фантазія ці мода. Гэта дазволіць нам прапанаваць шырокае разуменне таго, што азначае ісці разам, з далейшым тэалагічным паглыбленнем і тлумачэннем. Акрамя таго, неабходна праясніць адносіны паміж сінадальнасцю і еднасцю, а таксама паміж сінадальнасцю і калегіяльнасцю.

k) Узнікла жаданне палепшыць разуменне і ацэнку адрозненняў у практыцы і разуменні сінадальнасці паміж традыцыяй хрысціянскага Усходу і лацінскай традыцыяй, у тым ліку ў гэтым сінадальным працэсе, які працягваецца, праз спрыянне сустрэчам паміж імі.

l) У прыватнасці, для больш глыбокага разважання варта разгледзець шматлікія праявы сінадальнага жыцця ў культурным кантэксце, дзе людзі прывыклі ісці разам як супольнасць і дзе не ўкараніўся індывідуалізм. Тым самым сінадальная практыка адыграе важную ролю ў прароцкім адказе Касцёла на індывідуалізм, які прымушае людзей паварочвацца ўнутр саміх сябе, на папулізм, які падзяляе, і на глабалізацыю, якая робіць усё аднародным і плоскім. Нягледзячы на тое, што сінадальнасць не вырашае гэтых праблем, яна тым не менш забяспечвае альтэрнатыўны спосаб існавання і дзеяння ў наш час, аб'ядноўваючы разнастайнасць пунктаў гледжання. Гэта абнадзейлівая альтэрнатыва, якая патрабуе далейшага вывучэння і асвятлення.

**Прапановы**

m) Багацце і глыбіня сінадальнага працэсу ўказваюць на каштоўнасць пашырэння ўдзелу і пераадолення перашкод для ўдзелу, якія ўзнікалі да гэтага часу.

n) Неабходна знайсці спосабы больш актыўнага ўключэння духавенства (дыяканаў, прэзбітэраў, біскупаў) у сінадальны працэс на працягу наступнага года. Сінадальны

Касцёл не можа абысціся без іх галасоў, вопыту і ўкладу. Мы павінны лепш зразумець прычыны, па якіх некаторыя адчувалі супраціўленне сінадальнаму працэсу.

o) Сінадальная культура павінна стаць больш міжпакаленнай, з прасторай для маладых людзей, каб яны маглі свабодна гаварыць самі, у сваіх сем'ях, а таксама са сваімі аднагодкамі і пастырамі, у тым ліку праз лічбавыя каналы.

p) Асамблея прапануе пасадзейнічаць да другой сесіі тэалагічнаму паглыбленню тэрміналагічнага і канцэптуальнага разумення паняцця і практыкі сінадальнасці, абапіраючыся на багатую спадчыну тэалагічных даследаванняў з часоў Другога Ватыканскага сабору, у прыватнасці, на дакументы Міжнароднай тэалагічнай камісіі пра *Сінадальнасць у жыцці і місіі Касцёла* (2018) і *Sensus fidei ў жыцці Касцёла* (2014).

q) Падобнага тлумачэння патрабуюць і кананічныя наступствы сінадальнасці. Для гэтага мы таксама прапануем да часу другой сесіі асамблеі стварыць спецыяльную міжкантынентальную камісію экспертаў-тэолагаў і каналістаў.

r) Нарэшце, зараз патрабуецца больш шырокі перагляд Кодэкса кананічнага права і Кодэкса канонаў Усходніх Касцёлаў. Таму рэкамендуецца правесці папярэдняе даследаванне.

## 2. Сабраныя і пасланыя Тройцай

### Агульныя пункты погляду

a) Згодна з вучэннем Другога Ватыканскага сабору, Касцёл – гэта «народ, з’яднаны еднасцю Айца, і Сына, і Духа Святога» (LG 4). Айцец праз місію Сына і дар Духа ўключае нас у дынамізм камуніі і місіі, які вядзе нас ад «я» да «мы» і ставіць нас на служэнне свету. Сінадальнасць пераводзіць трынітарны дынамізм, з якім Бог выходзіць насустрач чалавецтву, у духоўныя адносіны і касцёльныя працэсы. Для гэтага неабходна, каб усе ахрышчаныя ўзялі на сябе абавязак узаемнага выканання свайго паклікання, харызмы і служэння. Толькі такім чынам Касцёл сапраўды можа стаць «размовай» (пар. *Ecclesiam suam*, 67) у сабе і са светам, ідучы побач з кожным чалавекам у стылі Езуса.

b) Сінадальны шлях Касцёла з самага пачатку скіраваны да Валадарства, якое цалкам здзейсніцца, калі Бог будзе ўсім ва ўсім. Сведчанне касцёльнага братэрства і місійная адданасць служэнню самым малым ніколі не параўнаюцца з той Таямніцай, знакам і прыладай якой яны таксама з’яўляюцца. Касцёл разважае над сваёй сінадальнай структурай не для таго, каб паставіць сябе ў цэнтр абвяшчэння, а для таго, каб найлепшым чынам выканаць, нават у сваёй канстытутыўнай незавершанасці, сваё служэнне прыходу Валадарства.

c) Абнаўленне хрысціянскай супольнасці магчыма толькі праз прызнанне першынства ласкі. Калі не хапае духоўнай глыбіні, сінадальнасць застаецца касметычным абнаўленнем фасада. Але тое, да чаго мы пакліканы, гэта не толькі выкарыстоўваць у супольных працэсах духоўны вопыт, атрыманы ў іншых месцах, але і глыбей адчуваць, што ўзаемныя адносіны з’яўляюцца месцам і формай сапраўднай сустрэчы з Богам. У гэтым сэнсе сінадальная перспектыва, абапіраючыся на багатую духоўную спадчыну Традыцыі, спрыяе аднаўленню яе форм: малітвы, адкрытай для ўдзелу, распазнавання, якое перажываецца разам, і місійнай энергіі, якая ўзнікае з дзялення і выпраменьваецца як служэнне.

d) Размова ў Духу – гэта інструмент, які нягледзячы на свае абмежаванні дазваляе аўтэнтычна слухаць, каб распазнаць, што Дух кажа Касцёлам. Яе практыка выклікала радасць, трапятанне і ўдзячнасць і перажывалася як шлях аднаўлення, які перамяняе людзей, групы і Касцёл. Слова «размова» выражае больш, чым просты дыялог: яно пераплятае думкі і пачуцці, ствараючы супольную жыццёвую прастору. Таму можна сказаць, што ў размове адбываецца навяртанне. Гэта антрапалагічная рэчаіснасць розных народаў і культур, якія

збіраюцца разам у салідарнасці, каб вырашаць жыццёва важныя для грамадства справы. Ласка даводзіць гэты чалавечы вопыт да плёну. Размаўляць «у Духу» азначае перажываць вопыт удзелу ў святле веры і шукаць Божую волю ў сапраўднай евангельскай атмасферы, у якой можна пачуць бясспрэчны голас Духа Святога.

e) Паколькі сінадальнасць прызначана для місіі, хрысціянскія супольнасці павінны быць салідарнымі з супольнасцямі іншых рэлігій, перакананняў і культур, пазбягаючы такім чынам, з аднаго боку, рызыкі самарэферэнцыяльнасці і самазахавання, а з другога – страты ідэнтычнасці. Логіка дыялогу, якая выяўляецца ва ўзаемным пазнанні і сумесным падарожжы, павінна пачаць характарызаваць евангельскае абвяшчэнне, служэнне тым, хто жыве ў беднасці, клопат пра наш агульны дом і тэалагічныя даследаванні.

**Пытанні для разгляду**

f) Для сапраўднага прыслухоўвання да волі Айца неабходна паглыбіць крытэрыі касцёльнага распазнавання з тэалагічнай перспектывы, каб спасылка на свабоду і навізну Духа адпаведным чынам каардынавалася з фактам, што Езус Хрыстус прыходзіць «раз і назаўсёды» (Гбр 10, 10). Гэта перш за ўсё азначае ўдакладненне ўзаемасувязі паміж слуханнем Божага слова, засведчанага ў Святым Пісанні, прыняццем Традыцыі і Настаўніцтва Касцёла і прароцкім чытаннем знакаў часу.

g) Для гэтага вельмі важна спрыяць антрапалагічнаму і духоўнаму бачанню, здольнаму інтэграваць, а не проста супрацьпастаўляць інтэлектуальнае і эмацыянальнае вымярэнні вопыту веры, пераадольваючы ўсялякі рэдукцыянізм і дуалізм паміж розумам і пачуццём.

h) Важна праясніць, якім чынам размова ў Духу можа аб’ядноўваць уклад тэалагічнай думкі, гуманітарных і сацыяльных навук разам з іншымі мадэлямі касцёльнага распазнавання, такімі як падыход «бачыць, судзіць, дзейнічаць» або крокі «распазнаць, інтэрпрэтаваць, выбраць».

i) Варта развіваць той уклад, які могуць унесці ў практыку распазнавання *lectio divina* і розныя духоўныя традыцыі, старажытныя і нядаўнія. Сапраўды, варта цаніць мноства формаў і стыляў, метадаў і крытэрыяў, якія на працягу стагоддзяў прапаноўваў Дух Святы і якія з’яўляюцца часткай духоўнай спадчыны Касцёла.

**Прапановы**

j) Прапануецца, каб Касцёлы эксперыментавалі і адаптавалі размову ў Духу і іншыя формы распазнавання тымі спосабамі, якія палічаць патрэбнымі, абапіраючыся на разнастайныя духоўныя традыцыі, адпаведныя патрэбам і культурам іх асяроддзя. Гэтай практыцы могуць спрыяць адпаведныя формы суправаджэння, якія дапамогуць зразумець яе логіку і пераадолець магчымы супраціў.

k) Мы заахвочваем кожны мясцовы Касцёл забяспечыць сябе адпаведнымі людзьмі, падрыхтаванымі для палягчэння і суправаджэння працэсаў касцёльнага распазнавання.

l) Каб асвятліць касцёльнае жыццё, можна з карысцю рэалізаваць практыку распазнавання ў пастырскай сферы тым спосабам, які адпавядае кантэксту. Гэта дазволіць лягчэй распазнаваць прысутныя ў супольнасці харызмы, мудра davяраць заданні і служэнне. Выходзячы за рамкі простага планавання дзейнасці, мы зможам планаваць пастырскі шлях у святле Духа.

## 3. Уваход у супольнасць веры: хрысціянскае ўтаямнічанне

**Агульныя пункты погляду**

a) Хрысціянскае ўтаямнічанне – гэта шлях, дзякуючы якому Пан праз служэнне Касцёла ўводзіць нас у пасхальную веру і далучае да трынітарнай і касцёльнай еднасці. Гэтае падарожжа прымае розныя формы ў залежнасці ад узросту, у якім здзяйсняецца, і ад розных акцэнтаў, характэрных для ўсходняй і заходняй традыцый. Аднак слуханне Слова і навяртанне жыцця, літургічная цэлебрацыя і ўваходжанне ў супольнасць і яе місію заўсёды ўзаемазвязаны. Менавіта таму катэхумэнальнае падарожжа з паступовасцю яго этапаў і крокаў з'яўляецца парадыгмай кожнага касцёльнага вопыту сумеснага крочання.

b) Утаямнічанне дае нам кантакт з вялікай разнастайнасцю пакліканняў і касцёльных паслуг. Усе яны выражаюць мацярынскае аблічча Касцёла, спосаб існавання, які вучыць сваіх дзяцей крочыць, ідучы з імі. Касцёл слухае іх і, адказваючы на іх сумневы і пытанні, узбагачаецца навізной, якую кожны чалавек уносіць праз сваю гісторыю, мову і культуру. Дзякуючы гэтай пастырскай дзейнасці хрысціянская супольнасць упершыню сустракаецца з сінадальнасцю, часта не ўсведамляючы яе цалкам.

c) Яшчэ да ўсялякага адрознення харызмаў і служэнняў «усе мы ў адным Духу ахрышчаныя ў адно цела» (1 Кар 12, 13). Такім чынам, сярод усіх ахрышчаных існуе сапраўдная роўнасць годнасці і агульная адказнасць за місію ў залежнасці ад паклікання кожнага. Дзякуючы намашчэнню Духа, якое «вучыць усяму» (1 Ян 2, 27), усе вернікі валодаюць інстынктам праўды Евангелля, або *sensus fidei*. Ён заключаецца ў пэўнай натуральнай блізкасці з боскай рэчаіснасцю і здольнасці інтуітыўна спасцігаць тое, што адпавядае праўдзе веры. Сінадальныя працэсы ўзмацняюць гэты дар, дазваляючы пацвердзіць існаванне кансэнсусу вернікаў (*consensus fidelium*). Гэты працэс забяспечвае надзейны крытэрый для вызначэння прыналежнасці таго ці іншага вучэння або практыкі да апостальскай веры.

d) Ласка Пяцідзясятніцы прабывае ў Касцёле праз сакрамэнт канфірмацыі. Яна ўзбагачае вернікаў багаццем дароў Духа. Яна заклікае іх развіваць сваё асаблівае пакліканне, укаранёнае ў агульнай годнасці хросту, у служэнні місіі. Неабходна больш падкрэсліваць яе важнасць, і трэба вызначыць яе месца ў сувязі з разнастайнасцю харызмаў і служэнняў, якія ўтвараюць сінадальнае аблічча Касцёла.

e) Цэлебрацыя Эўхарыстыі, асабліва ў нядзелю, з'яўляецца першай і асноўнай формай, у якой святы Божы народ збіраецца і сустракаецца. Калі гэта немагчыма, то супольнасць, хоць і прагне Эўхарыстыі, збіраецца, каб цэлебраваць Літургію слова. У Эўхарыстыі мы цэлебруем таямніцу дадзенай нам ласкі. Заклікаючы нас да ўдзелу ў сваім Целе і Крыві, Пан збірае нас у адно цела, паміж сабою і з самім сабой. Пачынаючы з выкарыстання Паўлам тэрміна *koinonia* (пар. 1 Кар 10, 16–17), хрысціянская традыцыя шанавала слова «камунія», каб адначасова ўказваць на поўны ўдзел у Эўхарыстыі і на характар адносін паміж вернікамі і паміж Касцёламі. Адкрываючы нас да сузірання боскага жыцця, да неспасцігальных глыбінь трынітарнай таямніцы, гэты тэрмін таксама адносіцца да «штодзённасці» нашых адносін: у самых простых жэстах, якімі мы адкрываемся адно аднаму, сапраўды адчуваецца подых Духа. Вось чаму камунія, якая вынікае з Эўхарыстыі і цэлебруецца ў ёй, вызначае і накіроўвае шляхі сінадальнасці.

f) З Эўхарыстыі мы вучымся злучаць адзінства і разнастайнасць: адзінства Касцёла і мноства хрысціянскіх супольнасцяў; адзінства сакраментальнай таямніцы і разнастайнасць літургічных традыцый; адзінства цэлебрацыі і разнастайнасць пакліканняў, харызмаў і служэнняў. Нішто лепш за Эўхарыстыю не паказвае, што гармонія, створаная Духам, не з'яўляецца аднастайнасцю і што кожны касцёльны дар прызначаны для агульнага будавання.

**Пытанні для разгляду**

g) Сакрамэнт хросту нельга разумець ізалявана або па-за логікай хрысціянскага ўтаямнічання, а таксама індывідуалістычна. Таму нам неабходна далейшае вывучэнне таго, які ўклад больш цэласнае бачанне хрысціянскага ўтаямнічання можа ўнесці ў разуменне сінадальнасці.

h) Спелае практыкаванне *sensus fidei* патрабуе не толькі прыняцця хросту, але і жыцця ў сапраўдным вучнёўстве, якое развівае ласку хросту. Гэта дазваляе нам адрозніць дзеянне Духа ад проста дамінуючых формаў мыслення, або культурнай абумоўленасці, або ад рэчаў, якія не адпавядаюць Евангеллю. Разуменне выкарыстання *sensus fidei* павінна быць паглыблена адпаведным тэалагічным разважаннем.

i) Разважанне над сінадальнасцю можа прапанаваць новае разуменне канфірмацыі, праз якую ласка Духа злучае разнастайнасць дароў і харызмаў у гармонію Пяцідзясятніцы. У святле рознага касцёльнага вопыту трэба разгледзець спосабы зрабіць падрыхтоўку і цэлебрацыю гэтага сакрамэнту больш плённымі, каб абудзіць ва ўсіх верніках заклік да будавання супольнасці, місіі ў свеце і сведчання веры.

j) З перспектывы пастырскай тэалогіі важна працягваць даследаванні таго, якім чынам катэхумэнальны шлях можа натхніць іншыя пастырскія шляхі, такія як падрыхтоўку да шлюбу, суправаджэнне ў выбары прафесійных і сацыяльных абавязацельстваў або фармацыю да святарскага служэння, у якой павінна быць задзейнічана ўся касцёльная супольнасць.

**Прапановы**

k) Калі Эўхарыстыя фарміруе сінадальнасць, то першы крок, які мы павінны зрабіць, гэта цэлебраваць Імшу так, як гэта адпавядае дару, з сапраўдным пачуццём сяброўства ў Хрысце. Літургія, якая цэлебруецца аўтэнтычна, з'яўляецца першай і асноўнай школай вучнёўства. Яе прыгажосць і прастата павінны сфарміраваць нас яшчэ да любой іншай арганізаванай праграмы фармацыі.

l) Другі крок датычыць шырока вядомай неабходнасці зрабіць літургічную мову больш даступнай для вернікаў і больш убудаванай у разнастайнасць культур. Неабходна, не ставячы пад сумнеў пераемнасць традыцыі і патрэбу ў лепшай літургічнай фармацыі, правесці больш глыбокае разважанне. Згодна з motu proprio *Magnum principium,* Канферэнцыям біскупаў у гэтым плане павінна быць даручана большая адказнасць.

m) Трэці крок заключаецца ў пастырскім імкненні да пашырэння супольнай малітвы па-за межы цэлебрацыі Імшы. Альтэрнатыўныя формы літургічнай малітвы, а таксама практыкі народнай пабожнасці, у якіх адлюстроўваецца адметнасць мясцовых культур, з'яўляюцца вельмі важнымі элементамі ў спрыянні ўдзелу ўсіх вернікаў. Яны ўводзяць вернікаў у хрысціянскую таямніцу, а тых, хто менш знаёмы з Касцёлам, набліжаюць да сустрэчы з Панам. Сярод форм народнай пабожнасці марыйная пабожнасць вылучаецца сваёй здольнасцю падтрымліваць і жывіць веру многіх.

## 4. Убогія — пратаганісты падарожжа Касцёла

**Агульныя пункты погляду**

a) Убогія просяць у Касцёла любові. Пад любоўю яны разумеюць павагу, прыняцце і прызнанне, без якіх харчаванне, грошы ці сацыяльныя паслугі з'яўляюцца формамі падтрымкі, якія, безумоўна, важныя, але не ў поўнай меры ўлічваюць годнасць асобы.

Кожны чалавек павінен мець магчымасць самастойна вызначаць спосабы росту, а не быць аб’ектам дабрабыту іншых. Прызнанне і павага – магутныя спосабы гэта зрабіць.

b) Выбар на карысць убогіх закладзены ў хрысталагічнай веры: Езус, убогі і сціплы, сябраваў з убогімі, дзяліў з імі стол і асуджаў прычыны ўбоства. Для Касцёла выбар на карысць убогіх з’яўляецца больш катэгорыяй тэалагічнай, чым культурнай, сацыялагічнай, палітычнай ці філасофскай. Святы Ян Павел ІІ казаў, што Бог ахвяруе сваю міласэрнасць найперш ім. Гэтая Божая прэферэнцыя ўплывае на жыццё ўсіх хрысціян, пакліканых да таго, каб мець думкі такія, як у Хрысце (пар. Флп 2, 5).

c) Убоства бывае не аднаго віду. Сярод многіх абліччаў тых, хто жыве ў нястачы, ёсць тыя, хто не мае рэчаў, неабходных для годнага жыцця. Ёсць таксама мігранты і бежанцы; карэнныя народы, першасныя народы і народы афрыканскага паходжання; тыя, хто зносіць гвалт і жорсткае абыходжанне, асабліва жанчыны; людзі, якія змагаюцца з залежнасцю; меншасці, якім сістэматычна адмаўляюць у праве голасу; пакінутыя старыя; ахвяры расізму, эксплуатацыі і гандлю людзьмі, асабліва непаўналетнія; эксплуатаваныя рабочыя; эканамічна выключаныя і іншыя, якія жывуць на перыферыі. Найбольш уразлівыя з уразлівых, якім патрэбна пастаяннае заступніцтва, уключаюць ненароджаных дзяцей і іх маці. Асамблея чуе крык «новых убогіх», спароджаных войнамі і тэрарызмам у многіх краінах на некалькіх кантынентах, і асуджае карумпіраваныя палітычныя і эканамічныя сістэмы, якія выклікаюць такія канфлікты.

d) Разам з формамі матэрыяльнай беднасці многія адчуваюць таксама нястачу духоўную, якая разумеецца як адсутнасць сэнсу жыцця. Празмерная заклапочанасць сабой можа прывесці да ўспрымання іншых як пагрозы, што, у сваю чаргу, прымушае нас далей паварочвацца ўнутр сябе, праяўляючы пэўны від індывідуалізму. Калі духоўна і матэрыяльна ўбогія сустракаюцца адзін з адным, яны пачынаюць шлях да пошуку адказаў на патрэбы адзін аднаго. Гэта шлях сумеснага крочання, які канкрэтызуе перспектыву сінадальнага Касцёла, які найбольш поўна раскрые нам сэнс евангельскага благаславення «Шчаслівыя ўбогія духам» (Мц 5, 3).

e) Каб стаяць побач з убогімі, неабходны сумесны ўдзел з імі ў клопаце аб нашым агульным доме: крык зямлі і крык тых, хто жыве ў беднасці – гэта адзін і той жа крык. Адсутнасць адказу на гэты крык стварае экалагічны крызіс і ў прыватнасці змяненне клімату – пагрозу для выжывання чалавецтва. Гэта падкрэслівае апостальская адгартацыя *Laudate Deum*, абнародаваная Папам Францішкам з нагоды пачатку працы сінадальнай асамблеі. Касцёлы ў краінах, найбольш падверажаных наступствам змены клімату, добра ўсведамляюць тэрміновую неабходнасць змены курсу, і гэта з’яўляецца іх укладам у падарожжа іншых мясцовых Касцёлаў у розных частках планеты.

f) Абавязак Касцёла – змагацца з прычынамі беднасці і адчужэння. Гэта ўключае ў сябе дзеянні па абароне правоў тых, хто выключаны, і можа запатрабаваць публічнага асуджэння несправядлівасці, учыненай грамадскімі структурамі або прыватнымі асобамі, карпарацыямі або ўрадамі. Каб пачуць голас тых, хто жыве ў беднасці, вельмі важна прыслухацца да іх патрабаванняў і пунктаў гледжання, а таксама выкарыстоўваць іх уласныя словы.

g) Хрысціяне абавязаны актыўна ўдзельнічаць у будаванні агульнага дабра і абароне годнасці жыцця, чэрпаючы натхненне з сацыяльнага вучэння Касцёла і супрацоўнічаючы рознымі спосабамі: праз удзел у грамадскіх арганізацыях, прафсаюзах, народных рухах, нізавых аб'яднаннях, у сферы палітыкі і інш. Касцёл глыбока ўдзячны за іх. Супольнасць абавязана падтрымліваць тых, хто працуе ў гэтых сферах, у духу сапраўднай дабрачыннасці і служэння. Іх дзейнасць з’яўляецца часткай місіі Касцёла па абвяшчэнні Евангелля і набліжэнні Божага Валадарства.

h) Хрысціянская супольнасць сустракаецца з абліччам і целам Хрыста, які, хоць і быў багаты, стаў убогім дзеля нас, каб мы ўзбагаціліся Ягоным ўбоствам (пар. 2 Кар 8, 9). Яна паклікана не толькі быць побач з убогімі, але і вучыцца ў іх. Калі стаць сінадальным азначае ісці разам з Тым, хто з’яўляецца дарогай, то сінадальны Касцёл павінен ставіць тых, хто пакутуе ад беднасці, у цэнтры ўсіх аспектаў свайго жыцця: дзякуючы свайму цярпенню яны ведаюць церпячага Хрыста (пар. *Evangelii gaudium*, 198). Падабенства іх жыцця да жыцця Пана робіць убогіх вестунамі збаўлення, атрыманага ў дар, і сведкамі радасці Евангелля.

**Пытанні для разгляду**

i) У некаторых частках свету Касцёл з’яўляецца убогім, прабывае з убогімі і служыць убогім. Існуе пастаянная рызыка, якой трэба старанна пазбягаць, калі ўбогіх разглядаюць з пункту гледжання «мы» і «яны», калі на іх глядзяць як на «аб'ект» любові Касцёла. Касцёл павінен усё больш і больш ставіць тых, хто зведвае ўбоства, у цэнтр сваёй увагі і вучыцца ў іх.

j) Прарочае асуджэнне сітуацый несправядлівасці з аднаго боку і спробы пераканаць палітыкаў дзейнічаць дзеля агульнага дабра, што патрабуе звароту да дыпламатыі, з другога павінны падтрымлівацца ў дынамічным напружанні, каб не страціць ясны кірунак і плённасць. У прыватнасці, неабходна сачыць за тым, каб выкарыстанне касцёльнымі органамі дзяржаўных або прыватных сродкаў не абмяжоўвала свабоды выказванняў за патрабаванні Евангелля.

k) Аказанне паслуг у галіне адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння без дыскрымінацыі або выключэння каго-небудзь з’яўляецца відавочным знакам Касцёла, які спрыяе інтэграцыі і ўдзелу найбольш уразлівых у Касцёле і грамадстве. Арганізацыям, якія працуюць у гэтай сферы, рэкамендуецца лічыць сябе выражэннем хрысціянскай супольнасці і старацца не абязлічваць дабрачыннасць. Мы таксама заклікаем іх працаваць арганізавана і ў каардынацыі з іншымі.

l) Касцёл павінен сумленна аналізаваць тое, як ён адпавядае патрабаванням справядлівасці сярод тых, хто працуе ў яго афіліяваных установах, каб былі гарантаваны паслядоўнасць і добрасумленнасць яго дзеянняў.

m) У сінадальным Касцёле салідарнасць таксама выяўляецца ў форме абмену дарамі і ў дзяленні рэсурсамі паміж мясцовымі Касцёламі з розных рэгіёнаў. Гэтыя адносіны спрыяюць адзінству Касцёла, ствараючы сувязі паміж задзейнічанымі хрысціянскімі супольнасцямі. Неабходна засяродзіцца на ўмовах, неабходных для таго, каб святары, якія прыходзяць на дапамогу Касцёлам, што маюць патрэбу ў духавенстве, не забяспечвалі проста функцыянальнага рашэння, а ўяўлялі сабой рэсурс для росту як Касцёла, які іх пасылае, так і Касцёла, які іх прымае. Падобным чынам, неабходна сачыць за тым, каб эканамічная дапамога не зводзілася проста да забеспячэння дабрабыту, але таксама спрыяла сапраўднай евангельскай салідарнасці і арганізоўвалася празрыста і надзейна.

**Прапановы**

n) Сацыяльнае вучэнне Касцёла з’яўляецца занадта малавядомай крыніцай. Гэтую праблему трэба вырашыць. Мы запрашаем мясцовыя Касцёлы не толькі зрабіць больш вядомым яго змест, але і паспрыяць яго прыняццю праз практыку, якая пераводзяць яго натхненне ў дзеянне.

o) Вопыт сустрэчы, сумеснага жыцця і служэння тым, хто жыве ў беднасці і на ўзбочыне, павінен быць неад’емнай часткай усіх шляхоў фармацыі, якія прапануюць хрысціянскія супольнасці: гэта патрабаванне веры, а не дадатковая магчымасць. Гэта асабліва актуальна для кандыдатаў да пасвячанага служэння і манаскага жыцця.

p) У межах пераасэнсавання дыяканскага служэння Касцёл павінен спрыяць больш моцнай арыентацыі на служэнне бедным.

q) Касцёльнае вучэнне, літургія і практыка павінны больш выразна і старанна задзейнічаць біблійныя і тэалагічныя асновы інтэгральнай экалогіі.

# 5. Касцёл «з кожнага роду, і мовы, і племені, і народа»

**Агульныя пункты погляду**

a) Хрысціяне жывуць у канкрэтных культурах, несучы ім Хрыста ў слове і сакрамэнтах, з пакорай і радасцю ўдзельнічаючы ў служэнні міласэрнасці, прымаючы таямніцу Хрыста, якая ўжо чакае нас у кожны час і ў кожным месцы. Тым самым мы становімся Касцёлам, які прымае людзей «з кожнага роду, і мовы, і племені, і народа» (Ап 5, 9).

b) Культурны, гістарычны і кантынентальны кантэксты, у якіх прысутнічае Касцёл, выяўляюць розныя духоўныя і матэрыяльныя патрэбы. Гэта фарміруе культуру мясцовых Касцёлаў, іх місійныя прыярытэты, клопаты і дары, якія кожны з іх уносіць у сінадальны дыялог, а таксама мовы, на якіх яны выказваюцца. На працягу дзён асамблеі мы змаглі непасрэдна і пераважна з радасцю адчуць розныя выразы быцця Касцёлам.

c) Касцёлы жывуць ва ўсё больш шматкультурным і шматрэлігійным кантэкстах. Гэта патрабуе пошуку шляхоў для стварэння дыялогу паміж рэлігіямі і культурамі, у якім хрысціяне павінны ўдзельнічаць разам са шматлікімі групамі, якія складаюць грамадства. Перажыванне місіі Касцёла ў гэтых умовах патрабуе стылю прысутнасці, служэння і абвяшчэння, які імкнецца будаваць масты, культываваць узаемаразуменне і ўдзельнічаць у евангелізацыі, якая суправаджае, слухае і вучыцца. На асамблеі гучаў вобраз «зняцця абутку», каб пераступіць парог да сустрэчы з іншым, праявіўшы пакору і павагу да сакральнай прасторы на роўных.

d) Міграцыя ператварае мясцовыя Касцёлы ў міжкультурныя супольнасці. Мігранты і бежанцы, многія з якіх маюць раны выгнання, вайны і насілля, часта становяцца крыніцай аднаўлення і ўзбагачэння для супольнасцяў, якія іх прымаюць, і магчымасцю ўстанаўлення прамых сувязяў з геаграфічна далёкімі Касцёламі. Перад абліччам усё больш варожага стаўлення да мігрантаў мы пакліканы адкрыта прымаць іх, суправаджаць іх у будаванні новага жыцця і ствараць сапраўдную міжкультурную еднасць паміж народамі. Павага да літургічных традыцый і рэлігійнай практыкі мігрантаў з’яўляецца неад’емнай часткай сапраўднага прыняцця.

e) Місіянеры аддалі сваё жыццё, каб несці Добрую Навіну ўсяму свету. Іх адданасць з’яўляецца вялікім сведчаннем моцы Евангелля. Аднак у тых кантэкстах, дзе слова «місія» напоўнена балючымі гістарычнымі ўспамінамі, якія перашкаджаюць сённяшняй еднасці, патрэбны асаблівая ўвага і чуласць. У некаторых месцах абвяшчэнне Евангелля было звязана з каланізацыяй і нават генацыдам. Евангелізацыя ў гэтых кантэкстах патрабуе прызнання дапушчаных памылак, вывучэння новай адчувальнасці да гэтых праблем і суправаджэння пакалення, якое імкнецца выкаваць хрысціянскую ідэнтычнасць у адарванасці ад каланіялізму. Павага і пакора з’яўляюцца галоўнай паставай, неабходнай для ўсведамлення таго, што мы дапаўняем адзін аднаго і што сустрэчы з рознымі культурамі могуць узбагаціць жыццё і асэнсаванне веры хрысціянскіх супольнасцяў.

f) Касцёл вучыць аб неабходнасці і заахвочвае да практыкі міжрэлігійнага дыялогу як часткі будавання еднасці паміж усімі народамі. У свеце насілля і раздробленасці ўсё больш актуальным з’яўляецца сведчанне адзінства чалавецтва, яго агульнага паходжання і агульнага лёсу ў скаардынаванай і ўзаемнай салідарнасці, скіраванай да сацыяльнай

справядлівасці, міру, прымірэння і клопату пра наш агульны дом. Касцёл усведамляе, што Дух можа прамаўляць праз жанчын і мужчын любой рэлігіі, веры і культуры.

**Пытанні для разгляду**

g) Нам неабходна выхоўваць большую адчувальнасць да багацця розных праяў быцця Касцёлам. Гэта патрабуе пошуку дынамічнай раўнавагі паміж вымярэннем Касцёла як цэлага і яго лакальнай укаранёнасцю, паміж павагай да повязяў адзінства Касцёла і рызыкай гамагенізацыі, якая душыць разнастайнасць. У розных кантэкстах значэнні і прыярытэты вар'іруюцца, і гэта патрабуе выяўлення і развіцця форм дэцэнтралізацыі.

h) Касцёл таксама пакутуе ад палярызацыі і недаверу ў такіх жыццёва важных пытаннях, як літургічнае жыццё, маральная, сацыяльная і тэалагічная рэфлексія. Мы павінны праз дыялог распазнаць прычыны кожнага з іх і распачаць адважныя працэсы ажыўлення еднасці і працэсы прымірэння, каб іх пераадолець.

i) У нашых мясцовых Касцёлах мы часам адчуваем напружанасць паміж рознымі спосабамі разумення евангелізацыі: паміж акцэнтам на сведчанні жыцця, імкненнем да развіцця чалавека, дыялогам з веравызнаннямі і культурамі і адкрытым абвяшчэннем Евангелля. У роўнай ступені ўзнікае напружанне паміж выразным абвяшчэннем Езуса Хрыста і ацэнкай асаблівасцей кожнай культуры ў пошуках евангельскіх рыс (*semina Verbi*), якія яны ўжо ўтрымліваюць.

j) У якасці аднаго з пытанняў, якія неабходна даследаваць, была названа магчымая блытаніна паміж пасланнем Евангелля і культурай тых, хто займаецца евангелізацыяй.

k) Рост канфліктаў з гандлем і выкарыстаннем усё больш магутнай зброі адкрывае пытанне, узнятае ў некалькіх групах, аб большай рэфлексіі і фармацыі, каб мы маглі кіраваць канфліктамі негвалтоўным спосабам. Гэта каштоўны ўклад, які хрысціяне могуць прапанаваць сучаснаму свету ў дыялогу і супрацоўніцтве з іншымі рэлігіямі.

**Прапановы**

l) Неабходна зноў звярнуць увагу на пытанне аб мове, якую мы выкарыстоўваем, каб размаўляць з розумам і сэрцамі людзей у самых розных кантэкстах так, каб гэта атрымлівалася прыгожа і даступна.

m) Нам патрэбна агульная структура для кіравання і ацэнкі эксперыментаў з формамі дэцэнтралізацыі, якая б вызначала ўсіх удзельнікаў і іх ролі. Дзеля аднастайнасці працэсы распазнавання адносна дэцэнтралізацыі павінны адбывацца ў сінадальным стылі, прадугледжваючы згоду і ўклад усіх удзельнікаў на розных узроўнях.

n) Патрэбны новыя парадыгмы пастырскага ўзаемадзеяння з карэннымі народамі, якія прымаюць форму супольнага падарожжа, а не дзеяння, зробленага для іх ці дзеля іх. Іх удзел у працэсах прыняцця рашэнняў на ўсіх узроўнях можа зрабіць уклад у больш актыўны і місійны Касцёл.

o) З працы асамблеі гучыць заклік да лепшага пазнання вучэння Другога Ватыканскага сабору, паслясаборнага навучання і сацыяльнага вучэння Касцёла. Мы павінны лепш ведаць нашы розныя традыцыі, каб больш выразна быць Касцёлам у еднасці Касцёлаў, эфектыўным у служэнні і дыялогу.

p) У свеце, дзе колькасць мігрантаў і бежанцаў павялічваецца, а жаданне прыняць іх памяншаецца і дзе на іншаземцаў глядзяць з усё большай падазронасцю, мэтазгодна, каб Касцёл рашуча заняўся адукацыяй, культурай дыялогу і сустрэчы, барацьбой з расізмам і ксенафобіяй, асабліва праз пастырскую фармацыю. У роўнай ступені неабходна займацца канкрэтнымі праектамі па інтэграцыі мігрантаў.

q) Мы рэкамендуем працягваць дыялог і распазнаванне адносна расавай справядлівасці. Сістэмы ўнутры Касцёла, якія ствараюць або падтрымліваюць расавую несправядлівасць, павінны быць вызначаны і выпраўлены. Неабходна стварыць працэсы аздараўлення і прымірэння з дапамогай тых, хто пацярпеў, каб выкараніць грэх расізму.

## 6. Усходнія Касцёлы і традыцыі Лацінскага Касцёла

**Агульныя пункты погляду**

a) Сярод Усходніх Касцёлаў тыя, што знаходзяцца ў поўнай еднасці з Наступнікам Пятра, карыстаюцца літургічнай, тэалагічнай, эклезіялагічнай і кананічнай адметнасцю, якая значна ўзбагачае ўвесь Касцёл. У прыватнасці, іх вопыт адзінства ў разнастайнасці можа ўнесці каштоўны ўклад у разуменне і практыку сінадальнасці.

b) На працягу гісторыі ўзровень аўтаноміі, дадзены гэтым Касцёлам, праходзіў праз розныя этапы. Некаторыя звычаі і працэдуры, напрыклад лацінізацыя, цяпер лічацца састарэлымі. У апошнія дзесяцігоддзі атрымаў значнае развіццё шлях да прызнання спецыфікі, адметнасці і аўтаноміі гэтых Касцёлаў.

c) Значная міграцыя вернікаў з каталіцкага Усходу на пераважна лацінскія тэрыторыі выклікае важныя пастырскія пытанні. Калі цяперашні ход падзей захаваецца або павялічыцца, вернікаў Усходніх Каталіцкіх Касцёлаў у дыяспары можа аказацца больш, чым на кананічных тэрыторыях. Па шэрагу прычын устанаўлення ўсходніх іерархій у краінах іміграцыі недастаткова для вырашэння праблемы, але існуе неабходнасць, каб мясцовыя Касцёлы лацінскага абраду ў імя сінадальнасці дапамагалі ўсходнім вернікам, якія эміравалі, захоўваць сваю самабытнасць і культываваць сваю спецыфічную спадчыну, не праходзячы праз працэсы асіміляцыі.

**Пытанні для разгляду**

d) Прапануем далейшае вывучэнне таго ўкладу, які вопыт Усходніх Каталіцкіх Касцёлаў можа зрабіць у разуменне і практыку сінадальнасці.

e) Застаюцца некаторыя цяжкасці, звязаныя з роляй Папы ва ўзгадненні біскупаў, абраных сінодамі Касцёлаў свайго права для сваёй тэрыторыі, і папскага прызначэння біскупаў за межамі кананічнай тэрыторыі. Просьба аб пашырэнні юрысдыкцыі патрыярхаў па-за межы патрыярхальных тэрыторый таксама з’яўляецца прадметам распазнавання і дыялогу з Апостальскай Сталіцай.

f) У рэгіёнах, дзе прысутнічаюць вернікі розных Каталіцкіх Касцёлаў, мы павінны знайсці мадэлі, якія робяць бачнымі эфектыўныя формы еднасці ў разнастайнасці.

g) Трэба задумацца над тым, які ўклад могуць зрабіць Усходнія Каталіцкія Касцёлы ў еднасць хрысціян, і над іх роляй у міжрэлігійным і міжкультурным дыялогах.

**Прапановы**

h) У першую чаргу з’явілася просьба аб стварэнні пастаяннай Рады патрыярхаў і вярхоўных арцыбіскупаў Усходніх Каталіцкіх Касцёлаў.

i) Некаторыя прасілі склікаць спецыяльны сінод, прысвечаны Усходнім Каталіцкім Касцёлам, іх ідэнтычнасці і місіі, а таксама пастырскім і кананічным праблемам у кантэксце вайны і масавай міграцыі.

j) Нам неабходна стварыць сумесную камісію з усходніх і лацінскіх тэолагаў, гісторыкаў і каноністаў для вырашэння пытанняў, якія патрабуюць далейшага вывучэння, і для

фармулявання прапаноў, якія паказваюць шлях наперад.

k) Члены Усходніх Каталіцкіх Касцёлаў павінны быць у дастатковай ступені прадстаўлены ў дыкастэрыях Рымскай курыі, каб узбагаціць увесь Касцёл іх перспектывамі, дапамагчы ў вырашэнні праблем па меры іх узнікнення і зрабіць магчымым іх удзел у дыялогу на розных узроўнях.

l) Для спрыяння формам прыняцця, якія паважаюць спадчыну вернікаў Усходніх Касцёлаў, мы павінны актывізаваць адносіны паміж усходнім духавенствам у дыяспары і лацінскім духавенствам для паглыблення ўзаемнага пазнання і прызнання адпаведных традыцый.

## 7. На шляху да еднасці хрысціян

### Агульныя пункты погляду

a) Гэтая сесія сінадальнай асамблеі адкрылася глыбокім экуменічным жэстам. На малітоўным чуванні «Разам» побач з Папам Францішкам прысутнічалі шматлікія іншыя лідары і прадстаўнікі розных хрысціянскіх супольнасцяў, што стала відавочным і надзейным знакам жадання ісці разам у духу еднасці веры і абмену дарамі. Гэтая важная падзея таксама дазволіла нам прызнаць, што мы знаходзімся ў экуменічным *кайросе*, і яшчэ раз пацвердзіць, што тое, што нас аб’ядноўвае, большае за тое, што нас раз’ядноўвае. Бо з агульнага ў нас «адзін Пан, адна вера, адзін хрост, адзін Бог і Айцец усіх, які над усімі, і праз усіх, і ва ўсіх» (Эф 4, 5–6).

b) Хрост, які ляжыць у аснове прынцыпу сінадальнасці, таксама складае аснову экуменізму. Праз яго ўсе хрысціяне ўдзельнічаюць у *sensus fidei*, і таму іх трэба ўважліва слухаць незалежна ад іх традыцыі, як гэта зрабіла сінадальная асамблея ў працэсе распазнавання. Не можа быць сінадальнасці без экуменічнага вымярэння.

c) Экуменізм – гэта перш за ўсё справа духоўнага аднаўлення, якое таксама патрабуе працэсаў пакаяння і аздараўлення памяці. Асамблея з узрушэннем пачула сведчанні хрысціян розных касцёльных традыцый, якія падзяляюць сяброўства, малітву і, перш за ўсё, адданасць служэнню тым, хто перажывае беднасць. Прысвячэнне сябе найменшаму з гэтага змацоўвае сувязі і дапамагае нам засяродзіцца на тым, што ўжо аб’ядноўвае ўсіх вернікаў у Хрыста. Таму важна, каб экуменізм практыкаваўся перш за ўсё ў штодзённым жыцці. У тэалагічным і інстытуцыйным дыялогу працягваецца цярплівае ткацтва ўзаемаразумення ў атмасферы ўзрастаючага даверу і адкрытасці.

d) У многіх рэгіёнах свету існуе «экуменізм крыві»: ён паходзіць ад хрысціян рознай прыналежнасці, якія аддаюць жыццё за веру ў Езуса Хрыста. Сведчанне іх пакутніцкай смерці больш красамоўнае за любыя словы. Адзінства паходзіць ад Крыжа Пана.

e) Супрацоўніцтва паміж усімі хрысціянамі мае вырашальнае значэнне ў адказе на пастырскія выклікі нашага часу. У секулярызаваным грамадстве яно дазваляе голасу Евангелля мець большую сілу. У кантэксце беднасці яно падштурхоўвае людзей аб’яднаць намаганні ў служэнні справядлівасці, міру і годнасці найменшых. Ва ўсіх выпадках гэта рэсурс для аздараўлення культуры нянавісці, расколу і вайны, якая зводзіць групы, народы і нацыі адно супраць аднаго.

f) Шлюбы паміж хрысціянамі, якія належаць да розных Касцёлаў або касцёльных супольнасцяў (змяшаныя шлюбы), могуць быць рэальнасцю, у якой можа выспяваць мудрасць еднасці і магчымасць евангелізаваць адно аднаго.

**Пытанні для разгляду**

g) Наша асамблея мела магчымасць убачыць розныя спосабы разумення сінадальнай канфігурацыі Касцёла ў розных хрысціянскіх традыцыях. У Праваслаўных Цэрквах сінадальнасць разумеецца ў строгім сэнсе як выраз калегіяльнай улады, уласцівай толькі біскупам (Свяшчэннаму Сіноду). У шырокім сэнсе гэта азначае актыўны ўдзел усіх вернікаў у жыцці і місіі Царквы. Згадваліся таксама некаторыя практыкі ў іншых касцёльных супольнасцях, што ўзбагаціла нашы дэбаты. Усё гэта патрабуе далейшага даследавання.

h) Іншая тэма, якую трэба даследаваць, датычыцца сувязі паміж сінадальнасцю і першынством на розных узроўнях (мясцовым, рэгіянальным, паўсюдным) у іх узаемнай залежнасці. Нам неабходна сумесна перачытаць гісторыю, каб пераадолець стэрэатыпы і прадузятасць. Бягучы экуменічны дыялог дазволіў лепш зразумець у святле практыкі першага тысячагоддзя той факт, што сінадальнасць і першынство з'яўляюцца звязанай, узаемадапаўняльнай і непадзельнай рэчаіснасцю. Высвятленне гэтага далікатнага моманту мае наступствы для разумення служэння Пятра на службе адзінству, згодна з пажаданнямі св. Яна Паўла II у энцыкліцы *Ut unum sint*.

i) Нам трэба разглядзець пытанне эўхарыстычнага ўдзелу (*communicatio in sacris*) з тэалагічнай, кананічнай і пастырскай перспектыў у святле сувязі паміж сакраментальнай і эклезіяльнай камуніяй. Гэтае пытанне з'яўляецца асабліва важным для змяшаных шлюбаў. Адсюль вынікае неабходнасць больш шырокага разважання аб змяшаных шлюбах.

j) Заахвочвалася таксама разважанне над з'явай «пазаканфесійных» суполак і натхнёных хрысціянствам рухаў «адраджэння», да якіх у вялікай колькасці далучаюцца вернікі, якія першапачаткова былі каталікамі.

**Прапановы**

k) У 2025 г. адзначаецца гадавіна Нікейскага сабору (325 г.), на якім быў распрацаваны *Сімвал веры*, які яднае ўсіх хрысціян. Супольнае ўшанаванне гэтай падзеі дапаможа нам лепш зразумець, як раней спрэчныя пытанні разам абмяркоўваліся і вырашаліся на саборы.

l) У тым жа 2025 г. дата ўрачыстасці Вялікадня прадбачліва супадзе для ўсіх Касцёлаў і хрысціянскіх супольнасцяў. Асамблея выказала вострае жаданне прыйсці да агульнай даты свята Вялікадня, каб мы маглі святкаваць Уваскрэсенне Пана, нашага жыцця і нашага збаўлення, у адзін дзень.

m) Таксама ёсць жаданне працягваць уключаць хрысціян іншых Касцёлаў і касцёльных традыцый у каталіцкія сінадальныя працэсы на ўсіх узроўнях і запрасіць большую колькасць братэрскіх дэлегатаў на наступную сесію асамблеі ў 2024 г.

n) Некаторыя вылучылі прапанову склікаць экуменічны сінод аб агульнай місіі ў сучасным свеце.

o) Было таксама прапанавана распрацаваць экуменічны мартыралог.

# ЧАСТКА II — УСЕ ВУЧНІ, УСЕ МІСІЯНЕРЫ

## 8. Касцёл у місіі

**Агульныя пункты погляду**

a) Замест таго, каб казаць, што Касцёл мае місію, мы сцвярджаем, што Касцёл з’яўляецца місіяй. «Як паслаў Мяне Айцец, так і Я пасылаю вас» (Ян 20, 21). Касцёл прымае сваю місію ад Хрыста, пасланага Айцом. Падтрыманы і кіраваны Духам Святым, Касцёл абвяшчае і сведчыць аб Евангеллі тым, хто яго не ведае і не прымае. Ён робіць гэта з выбарам на карысць убогіх, якія караніцца ў місіі Езуса. Тым самым Касцёл супрацоўнічае ў набліжэнні Божага Валадарства, насеннем якога Ён з’яўляецца (пар. LG 5).

b) Сакрамэнты хрысціянскага ўтаямнічання ўскладаюць адказнасць за місію Касцёла на ўсіх вучняў Езуса. Свецкія мужчыны і жанчыны, манаскія асобы і пасвячаныя служыцелі маюць роўную годнасць. Яны атрымалі розныя харызмы і пакліканні і выконваюць розныя ролі і функцыі, але ўсе пакліканы і падтрымліваюцца Духам Святым, каб утвараць адно цела ў Хрысце (1 Кар 4, 31). Усе яны вучні, усе місіянеры ва ўзаемнай жыццяздольнасці мясцовых супольнасцяў, якія адчуваюць цудоўную і суцяшальную радасць евангелізацыі. Рэалізацыя суадказнасці з’яўляецца істотнай для сінадальнасці і неабходная на ўсіх узроўнях Касцёла. Кожны хрысціянін – гэта місія на гэтай зямлі.

c) Сям’я з’яўляецца апорай кожнай хрысціянскай супольнасці. Першымі місіянерамі з’яўляюцца бацькі, дзядулі і бабулі і ўсе тыя, хто жыве і дзеліцца верай у сям’і. Сям’я як супольнасць жыцця і любові з’яўляецца прывілеяваным месцам выхавання ў веры і хрысціянскай практыцы і патрабуе асаблівага суправаджэння ў супольнасцях. Падтрымка асабліва патрэбна бацькам, якія павінны сумяшчаць працу, у тым ліку ў касцёльнай супольнасці і ў служэнні яе місіі, з патрабаваннямі сямейнага жыцця.

d) Калі місія з’яўляецца ласкай, якая датычыцца ўсяго Касцёла, то свецкія вернікі ўносяць істотны ўклад у развіццё гэтай місіі ва ўсіх сферах і ў штодзённых звычайных сітуацыях. Перш за ўсё менавіта яны робяць Касцёл прысутным і абвяшчаюць Евангелле, напрыклад, у лічбавай культуры, якая мае такі моцны ўплыў ва ўсім свеце; у моладзевай культуры; у свеце працы і бізнесу, палітыкі, мастацтва і культуры; у навуковых даследаваннях, адукацыі і прафесійнай падрыхтоўцы; у клопаце аб нашым агульным доме; і асабліва праз удзел у грамадскім жыцці. Усюды, дзе яны прысутнічаюць, яны пакліканы сведчыць пра Езуса Хрыста ў штодзённым жыцці і выразна дзяліцца верай з іншымі. Асаблівым чынам маладыя людзі са сваімі дарамі і слабасцямі, узрастаючы ў сяброўстве з Езусам, становяцца апосталамі Евангелля для сваіх равеснікаў.

e) Свецкія вернікі таксама становяцца ўсё больш прысутнымі і актыўнымі ў служэнні ў хрысціянскіх супольнасцях. Многія з іх арганізоўваюць і падтрымліваюць душпастырскія супольнасці, служаць настаўнікамі рэлігіі, тэолагамі і выхавацелямі, духоўнымі аніматарамі і катэхетамі, а таксама ўдзельнічаюць у розных парафіяльных і дыяцэзіяльных установах. У многіх рэгіёнах ад катэхетаў залежыць жыццё хрысціянскіх супольнасцяў і місія Касцёла. Акрамя таго, свецкія асобы служаць у ахове і кіраванні. Усе гэтыя ўклады неабходныя для місіі Касцёла; па гэтай прычыне неабходна паклапаціцца аб набыцці неабходнай кампетэнцыі.

f) У сваёй велізарнай разнастайнасці харызмы свецкіх уяўляюць сабой асобныя дары для Касцёла ад Духа Святога, якія трэба заклікаць, прызнаваць і ў поўнай меры цаніць. У некаторых сітуацыях свецкія могуць быць пакліканы, каб кампенсаваць недахоп святароў, з небяспекай таго, што свецкі характар іх апостальства можа быць аслаблены. У іншых сітуацыях святары ўсё робяць самі, таму харызмы і служэнне свецкіх ігнаруюцца або

выкарыстоўваюцца недастаткова. Ва ўсіх кантэкстах існуе небяспека «клерыкалізацыі» свецкіх, пра якую казалі многія на асамблеі, г. зн. стварэння свайго роду свецкай эліты, якая ўмацоўвае няроўнасць і падзелы сярод Божага народа.

g) Місія ad gentes узаемна ўзбагачае Касцёлы, бо ў ёй удзельнічаюць не толькі самі місіянеры, але і ўся супольнасць, якая такім чынам натхняецца да малітвы, дзялення дабротамі і сведчання. Касцёлы, якім не хапае духавенства, не павінны адмаўляцца ад гэтага абавязацельства, у той час як тыя, хто мае больш паклікання да пасвячанага служэння, атрымліваюць карысць ад пастырскага супрацоўніцтва ў сапраўднай евангельскай логіцы. Усе місіянеры – свецкія мужчыны і жанчыны, манаскія асобы, дыяканы і святары, а асабліва члены місійных інстытутаў і місіянеры fidei donum – з’яўляюцца важным рэсурсам для стварэння сувязяў ведаў і абмену дарамі.

h) Місія Касцёла няспынна аднаўляецца і жывіцца Эўхарыстыяй, асабліва калі яе супольны і місійны характар выяўляецца ў поўнай меры.

**Пытанні для разгляду**

i) Неабходна працягваць паглыбляць тэалагічнае разуменне адносін паміж харызмамі і служэннем у місійным ключы.

j) Другі Ватыканскі сабор і наступнае настаўніцкае навучанне прадстаўляюць адметную місію свецкіх у плане асвячэння часовай і свецкай рэчаіснасці. Аднак рэальнасць такая, што пастырская практыка на парафіяльным, дыяцэзіяльным, а ў апошні час нават паўсюдным узроўнях усё часцей давярае свецкім людзям заданні і паслугі ў самім Касцёле. З гэтымі важнымі падзеямі неабходна ўзгадніць тэалагічную рэфлексію і кананічныя нормы, пазбягаючы дуалізму, які можа парушыць успрыманне адзінства місіі Касцёла.

k) Заахвочваючы суадказнасць усіх ахрышчаных за місію, мы прызнаём апостальскія здольнасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Мы хочам лепш ацаніць той уклад у евангелізацыю, які дае велізарнае багацце іх чалавечнасці. Мы прызнаём іх вопыт пакут, маргіналізацыі і дыскрымінацыі, які часам мае месца нават у хрысціянскай супольнасці.

l) Душпастырскія структуры неабходна рэарганізаваць, каб яны маглі лёгка распазнаваць, заклікаць і ажыўляць свецкія харызмы і служэнне, уключаючы іх у місійны дынамізм сінадальнага Касцёла. Пад кіраўніцтвам сваіх пастыраў супольнасці змогуць пасылаць людзей, а таксама падтрымліваць тых, каго адправілі на місію. Тым самым гэтыя структуры будуць у першую чаргу служыць місіі, якую вернікі выконваюць у грамадстве, сям’і і на працы, а не засяроджвацца выключна на ўнутраных справах або арганізацыйных клопатах.

m) Выраз «агульнаслужбовы Касцёл», які выкарыстоўваецца ў *Instrumentum laboris*, можа выклікаць непаразуменне. Яго значэнне трэба будзе ўдакладніць, каб зняць любыя неадназначнасці.

**Прапановы**

n) Патрэбна больш крэатыўнасці ў стварэнні служэнняў у адпаведнасці з патрэбамі мясцовых Касцёлаў, асабліва з удзелам моладзі. Можна падумаць аб далейшым пашырэнні абавязкаў, ускладзеных на існуючую паслугу лектара, – абавязкаў, якія ўжо больш шырокія, чым тыя, што выконваюцца ў літургіі. Яна магла б стаць больш поўным служэннем Божага слова, якое ў адпаведным кантэксце магло б таксама ўключаць у сябе прапаведаванне. Мы таксама маглі б вывучыць магчымасць заснавання паслугі для сямейных пар, якія імкнуцца падтрымліваць сямейнае жыццё і суправаджаюць людзей, якія рыхтуюцца да сакрамэнту сужэнства.

o) Мясцовым Касцёлам прапануецца разгледзець адпаведныя сродкі і моманты прызнання з боку супольнасці свецкіх харызмаў і служэнняў. Гэта можа адбыцца падчас літургічнай цэлебрацыі, падчас якой удзяляецца пастырскае даручэнне.

## 9. Жанчыны ў жыцці і місіі Касцёла

**Агульныя пункты погляду**

a) Мы створаныя мужчынамі і жанчынамі на вобраз і падабенства Божае. З самага пачатку стварэнне дэманструе еднасць і рознасць, даючы жанчынам і мужчынам агульную натуру, пакліканне і лёс, а таксама два розныя вопыты быцця чалавекам. Святое Пісанне сведчыць пра ўзаемадапаўняльнасць і ўзаемадзеянне жанчын і мужчын, а таксама пра тую дамову паміж імі, якая ляжыць у цэнтры Божага плана стварэння. Езус лічыў жанчын сваімі суразмоўцамі: Ён гаварыў з імі пра Божае Валадарства; Ён прымаў іх як вучаніц, як, напрыклад, Марыю з Бэтаніі. Гэтыя жанчыны, якія спазналі Яго моц аздараўлення, вызвалення і прызнання, падарожнічалі з Ім па дарозе з Галілеі ў Ерузалем (пар. Лк 8, 1-3). Ён даверыў абвяшчэнне Уваскрэсення ў велікодную раніцу жанчыне, Марыі Магдалене.

b) У Хрысце жанчыны і мужчыны апранутыя ў аднолькавую годнасць хросту (пар. Гал 3, 28) і роўным чынам атрымліваюць розныя дары Духа. Мы пакліканы да супольнасці любячых, неканкурэнтных адносін у Хрысце і да сумеснай адказнасці, якая павінна выяўляцца на кожным узроўні жыцця Касцёла. Мы, як сказаў нам разам Папа Францішак, «народ, сабраны і пакліканы сілай [сямі] благаслаўленняў».

c) У нас быў вельмі пазітыўны досвед узаемнасці паміж жанчынамі і мужчынамі падчас гэтай асамблеі. Разам мы паўтараем заклік, зроблены на папярэдніх этапах сінадальнага працэсу, каб Касцёл прыняў больш рашучы выбар разумець і суправаджаць жанчын з пастырскага і сакрамэнтальнага пункту гледжання. Жанчыны жадаюць дзяліцца сваім духоўным вопытам шляху да святасці на розных этапах жыцця: як маладыя жанчыны, як маці, у сяброўстве і адносінах, у сямейным жыцці любога ўзросту, у працоўным жыцці і ў манаскім жыцці. Жанчыны патрабуюць справядлівасці ў грамадстве, якое па-ранейшаму адзначаны сексуальным гвалтам, эканамічнай няроўнасцю і тэндэнцыяй ставіцца да іх як да прадметаў. Жанчыны пакутуюць ад гандлю людзьмі, вымушанай міграцыі і вайны. Пастырскае суправаджэнне і энергічнае заступніцтва за жанчын павінны ісці поплеч.

d) Жанчыны складаюць большасць нашых лавак і часта з’яўляюцца першымі місіянерамі веры ў сям’і. Манаскія асобы, як у сузіральным, так і ў апостальскім жыцці, з’яўляюцца фундаментальным і адметным дарам, знакам і сведчаннем сярод нас. Доўгая гісторыя жанчын-місіянерак, святых, тэолагаў і містыкаў таксама з’яўляецца магутнай крыніцай падтрымкі і натхнення для сучасных жанчын і мужчын.

e) Марыя з Назарэта, жанчына веры і Божая Маці, застаецца для ўсіх унікальнай крыніцай тэалагічнага, касцёльнага і духоўнага значэння. Марыя нагадвае нам аб паўсюдным заклiку ўважліва слухаць Бога і заставацца адкрытымі на Духа Святога. Яна ведала радасць выношвання і выхавання, цярпела боль і пакуты. Яна нарадзіла ў жабрацкіх умовах, стала бежанкай і перажыла смутак жорсткага забойства свайго Сына, але яна таксама спазнала веліч Яго Уваскрэсення і хвалу Пяцідзясятніцы.

f) Многія жанчыны выказвалі глыбокую ўдзячнасць за працу прэзбітэраў і біскупаў. Яны таксама казалі пра Касцёл, які раніць. Клерыкалізм, шавіністычны менталітэт і неадэкватныя праявы ўлады працягваюць наносіць раны абліччу Касцёла і шкодзіць яго супольнасці. Неабходна глыбокае духоўнае навяртанне як падмурак любой эфектыўнай структурнай змены. Сексуальны гвалт і злоўжыванне сілай і ўладай працягваюць заклікаць

да справядлівасці, аздараўлення і прымірэння. Мы задавалі пытанне, як Касцёл можа быць месцам, бяспечным для ўсіх.

g) Там, дзе парушаюцца годнасць і справядлівасць у адносінах паміж мужчынамі і жанчынамі ў Касцёле, мы аслабляем давер да нашага абвяшчэння ў адрас свету. Наш сінадальны шлях паказвае неабходнасць аднаўлення адносін і структурных змен. Тым самым мы можам лепш вітаць удзел і ўнёсак усіх – свецкіх і кансэкраваных жанчын і мужчын, дыяканаў, прэзбітэраў і біскупаў – як суадказных вучняў у місійнай справе.

h) Асамблея просіць, каб мы не паўтаралі памылку і не казалі пра жанчын як пра праблему. Замест гэтага мы прагнем развіваць Касцёл, у якім мужчыны і жанчыны вядуць дыялог, каб глыбей зразумець гарызонт Божага праекта, які разглядае іх разам як галоўных герояў, без падпарадкавання, выключэння і канкурэнцыі.

**Пытанні для разгляду**

i) Касцёлы ва ўсім свеце выказалі ясную просьбу, каб актыўны ўклад жанчын быў прызнаны і ацэнены і каб іх пастырскае лідарства ўзрастала ва ўсіх сферах жыцця і місіі Касцёла. Як Касцёл можа ўключыць больш жанчын у існуючыя ролі і паслугі, каб лепш выявіць дары і харызмы ўсіх і больш чуйна адрэагаваць на пастырскія патрэбы? Калі патрабуюцца новыя паслугі, хто іх павінен распазнаваць, на якіх узроўнях і якім чынам?

j) Адносна доступу жанчын да дыяканскага служэння выказваліся розныя пазіцыі. Для некаторых гэты крок быў бы непрымальны, бо яны лічаць яго разрывам з Традыцыяй. Для іншых, аднак, адкрыццё доступу для жанчын да дыяканату аднавіла б практыку ранняга Касцёла. Іншыя ж лічаць гэта адпаведным і неабходным адказам на знакі часу, верным Традыцыі і такім, які знойдзе водгук у сэрцах многіх, хто шукае новай энергіі і жыццяздольнасці ў Касцёле. Некаторыя выказваюць занепакоенасць тым, што такая просьба кажа пра трывожную антрапалагічную блытаніну, якая, калі яе задаволіць, пагодзіць Касцёл з духам эпохі.

k) Абмеркаванне гэтага пытання таксама звязана з больш шырокім разважаннем, якое працягваецца над тэалогіяй дыяканату (пар. раздзел 11 ніжэй).

**Прапановы**

l) Мясцовым Касцёлам прапануецца пашырыць сваю працу па слуханні, суправаджэнні і апецы над найбольш маргіналізаванымі жанчынамі ў іх сацыяльных умовах.

m) Неабходна неадкладна забяспечыць тое, каб жанчыны маглі ўдзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў і браць на сябе адказныя ролі ў душпастырстве і служэнні. Святы Айцец значна павялічыў колькасць жанчын на адказных пасадах у Рымскай курыі. Гэта павінна адбыцца і на іншых узроўнях касцёльнага жыцця, у манаскім жыцці і дыяцэзіях. Адпаведныя нормы неабходна ўнесці ў кананічнае права.

n) Неабходна працягваць тэалагічныя і душпастырскія даследаванні доступу жанчын да дыяканату, карыстаючыся вынікамі камісій, спецыяльна створаных Святым Айцом, і ўжо праведзенымі тэалагічнымі, гістарычнымі і экзегетычнымі даследаваннямі. Калі магчыма, вынікі гэтага даследавання павінны быць прадстаўлены на наступнай сесіі асамблеі.

o) Выпадкі працоўнай несправядлівасці і несумленнай аплаты ў Касцёле павінны разглядацца асабліва ў адносінах да жанчын у манаскім жыцці, да якіх занадта часта ставяцца як да таннай працоўнай сілы.

p) Неабходна значна пашырыць доступ жанчын да праграм фармацыі і тэалагічных даследаванняў. Мы прапануем, каб жанчыны таксама былі ўключаны ў праграмы навучання і падрыхтоўкі ў семінарыі, каб спрыяць лепшай падрыхтоўцы да пасвячанага служэння.

q) Неабходна пераканацца, што літургічныя тэксты і касцёльныя дакументы больш уважліва ставяцца да выкарыстання мовы, якая аднолькава ўлічвае як мужчын, так і жанчын, а таксама ўключае шэраг слоў, вобразаў і апавяданняў, якія больш шырока абапіраюцца на вопыт жанчын.

r) Мы прапануем, каб жанчыны атрымлівалі адпаведную адукацыю, якая дазволіла б ім быць суддзямі ва ўсіх кананічных працэсах.

## 10. Манаскае жыццё і свецкія асацыяцыі і рухі: харызматычны знак

**Агульныя пункты погляду**

a) Касцёл заўсёды карыстаўся дарам харызмаў, ад самых незвычайных да самых простых. Праз іх Дух Святы з радасцю і ўдзячнасцю амалоджвае і абнаўляе Касцёл. Святы Божы народ прызнае ў гэтых харызмах правідэнцыяльную дапамогу, праз якую Бог падтрымлівае, накіроўвае і асвятляе сваю місію.

b) Харызматычнае вымярэнне Касцёла выяўляецца ў багатых і разнастайных формах манаскага жыцця. Гэтае сведчанне спрыяе абнаўленню жыцця касцёльнай супольнасці ў кожную эпоху і дае проціяддзе супраць вечнай спакусы прыземнага жыцця. Разнастайныя сем’і, з якіх складаецца манаскае жыццё, дэманструюць прыгажосць вучнёўства і святасці ў Хрысце ці то праз свае адметныя формы малітвы, праз служэнне людзям, ці то праз формы супольнага жыцця, адзіноту сузіральнага жыцця або жыццё на мяжы новых культур. Кансэкраваныя асобы часта першымі адчувалі важныя гістарычныя змены і прыслухоўваліся да падказак Духа. Іх прарочы голас і дзеянне патрэбны Касцёлу і сёння. Хрысціянская супольнасць таксама прызнае і жадае быць уважлівай да практык сінадальнага жыцця і распазнавання, якія былі выпрабаваны ў супольнасцях манаскага жыцця і выспявалі на працягу стагоддзяў. Мы ведаем, што можам навучыцца ў іх мудрасці, як крочыць сінадальным шляхам. Многія кангрэгацыі і інстытуты практыкуюць размову ў Духу або падобныя формы распазнавання падчас правінцыяльных і генеральных капітулаў, каб абнаўляць структуры, пераасэнсоўваць лад жыцця і ўводзіць інавацыйныя формы служэння і набліжэнне да самых бедных. У іншых выпадках, аднак, мы знаходзім захаванне аўтарытарнага стылю, які не пакідае месца для дыялогу.

c) З такой жа ўдзячнасцю Божы народ успрымае тое зерне аднаўлення ў супольнасцях з доўгай гісторыяй, якое расцвіло ў новыя касцёльныя супольнасці. Асацыяцыі свецкіх, касцёльныя рухі і новыя супольнасці з’яўляюцца каштоўным знакам сталення сумеснай адказнасці ўсіх ахрышчаных. Яны маюць асаблівую каштоўнасць з-за свайго вопыту спрыяння еднасці паміж рознымі паклікаммі, з-за імпэту, з якім яны абвяшчаюць Евангелле, з-за сваёй блізкасці да тых, хто знаходзіцца на ўзбочыне ў эканамічным і сацыяльным плане, а таксама праз спрыянне агульнаму дабру. Яны часта з’яўляюцца мадэлямі сінадальнай камуніі і ўдзелу ў місіі.

d) Выпадкі рознага роду злоўжыванняў, з якімі сутыкаюцца вернікі і члены свецкіх аб’яднанняў, асабліва жанчыны, паказваюць на праблемы ў ажыццяўленні ўлады і патрабуюць рашучага і адпаведнага ўмяшання.

**Пытанні для разгляду**

e) Настаўніцкі інстытут Касцёла мае добра развіты корпус навучання аб важнасці як іерархічных, так і харызматычных дароў у жыцці і місіі Касцёла. З гэтага вынікае неабходнасць глыбейшага эклезіяльнага разумення і тэалагічнай рэфлексіі. Таму варта нанова разгледзець эклезіялагічнае значэнне і канкрэтныя пастырскія наступствы гэтага навучання.

f) Разнастайнасць харызматычных выразаў у Касцёле падкрэслівае імкненне Божага народа быць прароцкай прысутнасцю побач з найменшымі братамі і сёстрамі і даваць сучаснай культуры больш глыбокае разуменне духоўных аспектаў жыцця. Неабходна развіць больш глыбокае разуменне таго, як манаскае жыццё, а таксама асацыяцыі свецкіх, касцёльныя рухі і новыя супольнасці ставяць свае харызмы на службу еднасці і місіі ў мясцовых Касцёлах, дапаўняючы існуючыя шляхі да святасці сваёй прароцкай прысутнасцю.

**Прапановы**

g) Мы лічым, што настаў час для перагляду дакумента *Mutuae relationes* 1978 г., які датычыць адносін паміж біскупамі і манаскімі асобамі ў Касцёле. Мы прапануем, каб гэты перагляд быў завершаны сінадальным шляхам, пры дапамозе кансультацыі з усімі ўдзельнікамі.

h) З гэтай жа мэтай неабходна ў сінадальным духу стварыць сродкі і інструменты для спрыяння сустрэчам і формам супрацоўніцтва паміж Канферэнцыямі біскупаў і канферэнцыямі настаяцеляў і вышэйшых настаяцеляў інстытутаў кансэкраванага жыцця і таварыстваў апостальскага жыцця.

i) На ўзроўні асобных мясцовых Касцёлаў і груп Касцёлаў спрыянне місійнай сінадальнасці патрабуе стварэння і адладжвання рад і кансультатыўных органаў, у якіх прадстаўнікі асацыяцый свецкіх, касцёльных рухаў і новых супольнасцей змогуць сустракацца, каб развіваць трывалыя адносіны паміж іх жыццём і дзейнасцю і жыццём і дзейнасцю мясцовых Касцёлаў.

j) У тэалагічнай фармацыі на ўсіх узроўнях, перш за ўсё ў фармацыі пасвячаных служыцеляў, неабходна сачыць за тым, каб аддавалася перавага харызматычнаму вымярэнню Касцёла і каб яна пры неабходнасці ўзмацнялася.

## 11. Дыяканы і прэзбітэры ў сінадальным Касцёле

**Агульныя пункты погляду**

a) Прэзбітэры з’яўляюцца галоўнымі супрацоўнікамі біскупа, утвараючы з ім адзін прэзбітэрат (пар. LG 28). Дыяканы пасвячаюцца для служэння народу Божаму ў дыяканіі слова, у літургіі, але перш за ўсё ў здзяйсненні спраў міласэрнасці (пар. LG 29). Сінадальная асамблея жадае найперш выказаць святарам і дыяканам глыбокую ўдзячнасць. Усведамляючы, што яны могуць перажываць адзіноту і ізаляцыю, яна заахвочвае хрысціянскія супольнасці падтрымліваць іх малітвай, сяброўствам і супрацоўніцтвам.

b) Дыяканы і прэзбітэры ўдзельнічаюць у служэнні ў самых розных пастырскіх умовах: у парафіях, у евангелізацыі тых, хто жыве ў беднасці і маргіналізацыі, у свеце культуры і адукацыі, а таксама ў місіі *ad gentes*, у тэалагічных даследаваннях, у рэкалекцыйных цэнтрах і месцах духоўнага аднаўлення і шмат якіх іншых. У сінадальным Касцёле пасвячаныя служыцелі пакліканы весці сваё служэнне Божаму народу ў блізкасці да людзей, прымаючы і слухаючы ўсіх, выхоўваючы пры гэтым глыбокую асабістую духоўнасць і малітоўнае жыццё. Перш за ўсё ад іх патрабуецца перагледзець выкананне ўлады, узяўшы прыклад з Езуса, які, «будучы ў постаці Бога… выракся самога сябе, прыняўшы постаць слугі» (Флп 2, 6-7). Асамблея прызнае, што праз сваю адданасць многія святары і дыяканы робяць прысутным Хрыста, Добрага Пастыра і Слугу.

c) Адной з перашкод для служэння і місіі з’яўляецца клерыкалізм. Клерыкалізм паходзіць з няправільнага разумення Божага паклікання, бо разглядае яго больш як прывілею, чым служэнне, і выяўляецца ў ажыццяўленні ўлады ў свецкай манеры, якая адмаўляецца дазволіць сабе несці адказнасць. З гэтым скажэннем святарскага паклікання трэба

змагацца з самых ранніх этапаў фармацыі, забяспечваючы цесны кантакт з Божым народам і праз канкрэтны вопыт служэння сярод найбольш патрабуючых. Выкананне святарскага служэння сёння можна ўявіць толькі ў гармоніі з біскупам і прэзбітэратам і ў глыбокай еднасці з іншымі служэннямі і харызмамі. На жаль, клерыкалізм – гэта пастава, якая можа выяўляцца не толькі сярод служыцеляў, але і сярод свецкіх.

d) Каб выконваць пасвячанае служэнне ў кантэксце суадказнасці, неабходна ўсведамляць свае магчымасці і абмежаванні. Па гэтай прычыне важна пераканацца, што рэалістычны падыход да фармацыі чалавека спалучаецца з культурным і духоўным вымярэннем фармацыі, а таксама з фармацыяй для вучнёўства. Нельга недаацэньваць у гэтым плане ўклад сем'яў паходжання і хрысціянскай супольнасці, у якой выхоўваецца пакліканне маладога чалавека, а таксама іншых сем'яў, якія суправаджаюць яго рост.

**Пытанні для разгляду**

e) У кантэксце падрыхтоўкі ўсіх ахрышчаных да служэння ў сінадальным Касцёле асаблівай увагі патрабуе фармацыя дыяканаў і прэзбітэраў. На гэтай асамблеі была шырока выказана просьба, каб семінарыі і іншыя праграмы святарскай фармацыі заставаліся звязанымі са штодзённым жыццём супольнасці. Нам трэба пазбягаць рызыкі фармалізму і ідэалогіі, якія вядуць да аўтарытарных адносін і перашкаджаюць сапраўднаму росту пакліканні. Перагляд праграм фармацыі патрабуе шырокага абмеркавання і разгляду.

f) Наконт святарскага цэлібату выказваліся розныя меркаванні. Усе цэняць яго багатае прароцкае значэнне і яго глыбокае сведчанне аб Хрысце; некаторыя, аднак, пытаюцца, ці павінна яго тэалагічная дарэчнасць для святарскага служэння абавязкова ператварацца ў дысцыплінарны абавязак у Лацінскім Касцёле, перш за ўсё ў тых касцельных і культурных кантэкстах, якія яго ўскладняюць. Гэтая дыскусія не новая, але патрабуе дадатковага разгляду.

**Прапановы**

g) У лацінскіх Касцёлах пастаянны дыяканат у розных касцёльных кантэкстах ажыццяўляўся па-рознаму. Некаторыя мясцовыя Касцёлы ўвогуле не ўвялі яго; у іншых ёсць занепакоенасць тым, што дыяканы ўспрымаюцца як свайго роду замена недахопу святароў. Часам іх служэнне выяўляецца ў літургіі, а не ў служэнні тым, хто жыве ў беднасці і мае патрэбу ў супольнасці. Таму мы рэкамендуем ацаніць, як ажыццяўлялася дыяканскае служэнне пасля Другога Ватыканскага сабору.

h) З тэалагічнага пункту гледжання неабходна разумець дыяканат перш за ўсё сам па сабе, а не толькі як ступень на шляху да прэзбітэрату. Вызначэнне асноўнай формы дыяканату як «пастаяннай», у адрозненне ад «пераходнай», само па сабе сведчыць аб змене пункту гледжання, якая яшчэ не была належным чынам рэалізавана.

i) Нявызначанасць, якая акружае тэалогію дыяканату, звязаная з тым, што толькі пасля Другога Ватыканскага сабору ён быў адноўлены як асобнае і пастаяннае іерархічнае служэнне ў Лацінскім Касцёле. Святло на пытанне доступу жанчын да дыяканату пральле больш глыбокае даследаванне.

j) Неабходны грунтоўны перагляд фармацыі для пасвячанага служэння з улікам місійнага і сінадальнага вымярэння Касцёла. Гэта азначае таксама перагляд *Ratio fundamentalis*, які вызначае структуру фармацыі. Мы таксама рэкамендуем адначасова забяспечыць прыняцце сінадальнага стылю, калі гаворка ідзе пра бесперапынную фармацыю святароў і дыяканаў.

k) Празрыстасць і культура падсправаздачнасці маюць для нас вырашальнае значэнне ў руху наперад для будаўніцтва сінадальнага Касцёла. Мы просім мясцовыя Касцёлы вызначыць

працэсы і структуры, якія дазваляюць праводзіць рэгулярны аўдыт таго, як прэзбітэры і дыяканы выконваюць адказныя ролі ў здзяйсненні свайго служэння. Існуючыя інстытуты, такія як органы з прамым удзелам або пастырскія візіты, могуць быць зыходным пунктам для гэтай працы, калі будуць уключаць у сябе супольнасць. Такія формы павінны быць адаптаваны да мясцовых кантэкстаў і розных культур, каб не быць перашкодай ці бюракратычным цяжарам. Распазнаванне неабходнага працэсу можа быць праведзена на рэгіянальным або кантынентальным узроўні.

l) У кожным канкрэтным выпадку і ў адпаведнасці з кантэкстам трэба разгледзець магчымасць паўторнага ўключэння прэзбітэраў, якія пакінулі служэнне, у душпастырскія паслугі, дзе цэняцца іх адукацыя і вопыт.

## 12. Біскуп у касцёльнай еднасці

**Агульныя пункты погляду**

a) Паводле Другога Ватыканскага сабору, біскупы як наступнікі апосталаў пастаўлены на службу еднасці, якая ажыццяўляецца ў мясцовым Касцёле, паміж Касцёламі і з усім Касцёлам. Таму ролю біскупа можна адпаведна зразумець толькі ў сетцы адносін, якая сплятаецца з даверанай яму часткі Божага народа, прэзбітэраў і дыяканаў, кансэкраваных асоб, іншых біскупаў і біскупа Рыма, а таксама з улікам пастаяннай арыентацыі на місію.

b) Біскуп у сваім Касцёле з’яўляецца галоўным адказным за абвяшчэнне Евангелля і літургію. Ён кіруе хрысціянскай супольнасцю і спрыяе душпастырству тых, хто жыве ў беднасці, і абароне найбольш уразлівых. Яму як бачнаму прынцыпу адзінства належыць, у прыватнасці, распазнаваць і каардынаваць розныя харызмы і паслугі, пасланыя Духам для абвяшчэння Евангелля і агульнага дабра супольнасці. Гэтае служэнне ажыццяўляецца ў сінадальным стылі, калі кіраванне суправаджаецца сумеснай адказнасцю, прапаведаванне – слуханнем вернага Божага народа, а асвячэнне і цэлебрацыя літургіі – пакорай і навяртаннем.

c) Біскуп мае незаменную ролю ў ажыўленні і развіцці сінадальнага працэсу ў мясцовым Касцёле, спрыяючы ўзаемнасці «ўсіх, некаторых і аднаго». *Адно* біскупскае служэнне шануе ўдзел *усіх* вернікаў праз уклад *некаторых*, якія больш непасрэдна ўдзельнічаюць у распазнаванні і працэсах прыняцця рашэнняў. Перакананасць, з якой сам біскуп прымае сінадальны падыход, і стыль, якім ён ажыццяўляе ўладу, вырашальным чынам уплываюць на тое, як прэзбітэры і дыяканы, свецкія мужчыны і жанчыны, а таксама кансэкраваныя асобы ўдзельнічаюць у сінадальным працэсе. Біскуп пакліканы быць прыкладам сінадальнасці для ўсіх.

d) У кантэкстах, дзе Касцёл успрымаецца як Божая сям’я, біскуп лічыцца бацькам для ўсіх; аднак існуе крызіс адносна таго, як яго аўтарытэт успрымаецца ў секулярызаваным грамадстве. Важна не выпускаць з-пад увагі сакраментальную прыроду епіскапату, каб роля біскупа не атаясамлівалася з роллю грамадзянскай улады.

e) Чаканне ў адносінах да біскупа часта вельмі вялікае, і многія біскупы казалі, што адчуваюць сябе перагружанымі адміністрацыйнымі і юрыдычнымі абавязацельствамі, з-за чаго ім цяжка ў поўнай меры рэалізаваць сваю місію. Біскуп таксама вымушаны мірыцца са сваёй слабасцю і абмежаваннямі і часам не мае патрэбнай падтрымкі, чалавечай ці духоўнай. Пэўнае пачуццё адзіноты не рэдкасць. Таму важна, з аднаго боку, засяродзіць увагу на элементах, неабходных для місіі біскупа, а з другога – культываваць сапраўднае братэрства паміж самімі біскупамі, а таксама паміж біскупамі і іх прэзбітэрамі.

**Пытанні для разгляду**

f) На тэалагічным узроўні неабходна значна паглыбіць значэнне ўзаемаадносін паміж біскупам і мясцовым Касцёлам. Біскуп пакліканы як кіравець мясцовым Касцёлам, так і ў той жа час прызнаваць і захоўваць багацце яго гісторыі, традыцый і харызм.

g) Пытанне пра сувязь паміж сакрамэнтам пасвячэння і юрысдыкцыяй патрабуе больш глыбокага вывучэння. У дыялогу з *Lumen gentium* і такімі навейшымі вучэннямі, як апостальская канстытуцыя *Praedicate Evangelium*, мэтай такога даследавання было б праясненне тэалагічных і кананічных крытэрыяў, якія ляжаць у аснове прынцыпу агульнай адказнасці біскупа, а таксама вызначэнне аб'ёму, формы і наступстваў сумеснай адказнасці.

h) Некаторыя біскупы выказваюць няёмкасць, калі іх просяць выказацца па пытаннях веры і маралі, а ў епіскапаце няма поўнай згоды. Неабходныя далейшыя разважанні аб адносінах паміж біскупскай калегіяльнасцю і разнастайнасцю тэалагічных і пастырскіх поглядаў.

i) Неад'емнай часткай сінадальнага Касцёла з'яўляецца забеспячэнне культуры празрыстасці і павагі да працэдур, устаноўленых для абароны непаўналетніх і ўразлівых людзей. Неабходна далейшае развіццё структур, якія займаюцца прафілактыкай злоўжыванняў. Далікатнае пытанне барацьбы са злоўжываннямі ставіць многіх біскупаў у складаную сітуацыю, калі яны павінны сумяшчаць ролю бацькі з роллю суддзі. Неабходна вывучыць мэтазгоднасць даручэння судовага задання іншаму органу, які павінен быць вызначаны кананічна.

**Прапановы**

j) Неабходна ўкараніць у юрыдычна вызначаных формах структуры і працэсы рэгулярнага агляду дзейнасці біскупа ў сувязі са стылем яго паўнамоцтваў, эканамічным кіраваннем маёмасцю дыяцэзіі і функцыянаваннем органаў з прамым удзелам, а таксама абаронай ад усіх магчымых відаў злоўжыванняў. Культура адказнасці з'яўляецца неад'емнай часткай сінадальнага Касцёла, якая спрыяе сумеснай адказнасці, а таксама абароне ад злоўжыванняў.

k) Гучаць заклікі зрабіць біскупскую раду (кан. 473, § 4), дыяцэзіяльную пастырскую раду і епархіяльную пастырскую раду (ККП, кан. 511; ККУЦ, кан. 272) абавязковымі, а таксама зрабіць больш эфектыўнымі дыяцэзіяльныя органы, якія нясуць сумесную адказнасць, у тым ліку ў юрыдычным плане.

l) Асамблея заклікае перагледзець крытэрыі адбору кандыдатаў у біскупы, збалансаваўшы паўнамоцтвы Апостальскага нунцыя ўдзелам Канферэнцый біскупаў. Ёсць таксама просьбы аб пашырэнні кансультацый з верным Божым народам, а таксама аб уключэнні ў працэс кансультацый большай колькасці свецкіх і кансэкраваных асоб і аб пазбяганні празмернага ціску ў працэсе адбору.

m) Многія біскупы гавораць пра неабходнасць пераасэнсавання функцыянавання і ўмацавання структуры мітраполій (касцёльных правінцый) і рэгіёнаў, каб яны маглі стаць канкрэтным выразам калегіяльнасці на тэрыторыі і праз братэрства, узаемную падтрымку, празрыстасць і больш шырокія кансультацыі сталі звычайнай практыкай сярод біскупаў.

## 13. Біскуп Рыма ў Калегіі біскупаў

**Агульныя пункты погляду**

a) Сінадальная дынаміка таксама пралівае новае святло на служэнне біскупа Рыма. Сапраўды, сінадальнасць сугучна злучае супольнае («усе»), калегіяльнае («некаторыя») і

асабістае («адзін») вымярэнні Касцёла на мясцовым, рэгіянальным і паўсюдным узроўнях. У такім бачанні Пятрова служэнне біскупа Рыма з'яўляецца неад'емнай часткай сінадальнай дынамікі, роўна як і супольны аспект, які ўключае ўвесь Божы народ, і калегіяльнае вымярэнне біскупскага служэння. Такім чынам, сінадальнасць, калегіяльнасць і першынство звязаны адно з адным: першынство прадугледжвае ажыццяўленне сінадальнасці і калегіяльнасці, гэтак жа як абедзве яны маюць на ўвазе ажыццяўленне першынства.

b) Важным аспектам служэння біскупа Рыма з'яўляецца спрыянне адзінству ўсіх хрысціян. Экуменічны шлях паглыбіў разуменне служэння Наступніка Пятра і павінен працягвацца ў будучыні. Адказы на запрашэнне, зробленае св. Янам Паўлам II у энцыкліцы *Ut unum sint*, а таксама вынікі экуменічных дыялогаў могуць дапамагчы каталіцкаму разуменню першынства, калегіяльнасці, сінадальнасці і іх узаемных адносін.

c) Рэформа Рымскай курыі з'яўляецца важным аспектам сінадальнага шляху Каталіцкага Касцёла. Апостальская канстытуцыя *Praedicate Evangelium* настойвае на тым, што «Рымская курыя не стаіць паміж Папам і біскупамі, а аддае сябе ім на службу такім чынам, што адпавядае прыродзе кожнага» (PE I.8). Яна спрыяе рэформе, заснаванай на «жыцці ў камуніі» (PE I.4) і «здаровай дэцэнтралізацыі» (PE II.2). Той факт, што многія члены рымскіх дыкастэрый з'яўляюцца дыяцэзіяльнымі біскупамі, сведчыць пра паўсюднасць Касцёла і павінен спрыяць узаемаадносінам паміж Курыяй і мясцовымі Касцёламі. Эфектыўнае выкананне *Praedicate Evangelium* можа спрыяць большай сінадальнасці ў Курыі, як паміж рознымі дыкастэрыямі, так і ў кожнай з іх.

**Пытанні для разгляду**

d) Існуе неабходнасць больш глыбокага асэнсавання таго, як новае разуменне епіскапату ў сінадальным Касцёле ўплывае на служэнне біскупа Рыма і ролю Рымскай курыі. Гэтае пытанне мае значныя наступствы для таго, як рэалізуецца суадказнасць у кіраванні Касцёлам. На паўсюдным узроўні Кодэкс кананічнага права і Кодэкс канонаў Усходніх Касцёлаў прапануюць палажэнні для больш калегіяльнага выканання папскага служэння. Яны могуць быць дапрацаваны на практыцы і ўзмоцнены ў будучым абнаўленні абодвух тэкстаў.

e) Сінадальнасць можа праліць святло на тое, як у Пятровым служэнні могуць супрацоўнічаць кардыналы, і на тое, як развіць іх калегіяльнае распазнаванне на звычайных і надзвычайных кансісторыях.

f) Для дабра Касцёла важна вывучаць найбольш прыдатныя шляхі спрыяння ўзаемнаму знаёмству і сувязям паміж членамі Калегіі кардыналаў, прымаючы пад увагу таксама іх разнастайнасць паходжання і культуры.

**Прапановы**

g) Візіты *ad limina Apostolorum* з'яўляюцца найвышэйшым момантам у адносінах пастыраў мясцовых Касцёлаў з біскупам Рыма і яго бліжэйшымі супрацоўнікамі ў Рымскай курыі. Неабходна перагледзець форму іх правядзення, каб яны ўсё больш станавіліся нагодай для адкрытага і ўзаемнага абмену, які спрые еднасці і сапраўднаму праяўленню калегіяльнасці і сінадальнасці.

h) У святле сінадальнай канфігурацыі Касцёла неабходна, каб дыкастэрыі Рымскай курыі ўзмацнілі кансультацыі з біскупамі, каб звярталася большая ўвага на разнастайнасць сітуацый і ўважліва слухаліся галасы мясцовых Касцёлаў.

i) Падаецца мэтазгодным устанавіць формы ацэнкі працы папскіх прадстаўнікоў мясцовымі Касцёламі ў тых краінах, дзе яны выконваюць сваю місію, каб развіваць і ўдасканальваць

іх служэнне.

j) Прапануецца пашыраць і ўмацоўваць вопыт рады кардыналаў (C-9) як сінадальнай рады на службе Пятровага служэння.

k) У святле вучэння Другога Ватыканскага сабору неабходна ўважліва ацаніць, ці мэтазгодна пасвячаць прэлатаў Рымскай курыі ў біскупы.

# ЧАСТКА III — ТКАННЕ СУВЯЗЯЎ, БУДАВАННЕ СУПОЛЬНАСЦІ

## 14. Сінадальны падыход да фармацыі

**Агульныя пункты погляду**

a) Кожны ахрышчаны пакліканы клапаціцца пра ўласную фармацыю як адказ на дары Пана, выкарыстоўваючы атрыманыя таленты, каб прыносіць плён і ставіць іх на служэнне ўсім. Час, які Пан прысвяціў фармацыі сваіх вучняў, указвае на важнасць касцёльнай фармацыі. Яна часта адбываецца на заднім плане, але з’яўляецца вырашальнай для місіі. Мы хочам выказаць словы падзякі і падбадзёрвання ўсім, хто ўдзельнічае ў гэтай працы, і запрашаем іх прыняць новую арыентацыю ў фармацыі, якая вынікае з сінадальнага шляху Касцёла.

b) Тое, як Езус фармаваў вучняў, з’яўляецца ўзорам, якога мы павінны прытрымлівацца. Ён не проста вучыў, а дзяліўся з імі сваім жыццём. Прыкладам уласнай малітвы Ён выклікаў у іх просьбу: «Навучы нас маліцца». Кормячы натоўп, Ён вучыў іх не ігнараваць патрабуючых. Ідучы ў Ерузалем, Ён паказаў шлях да Крыжа. З Евангелля мы вучымся, што фармацыя – гэта не толькі і не перш за ўсё ўмацаванне ўласных здольнасцяў; гэта навяртанне да «логікі» Валадарства, якая можа зрабіць плённымі нават паражэнні і няўдачы.

c) Святы Божы народ з’яўляецца не толькі аб’ектам, але перш за ўсё суадказным суб’ектам фармацыі. Першая фармацыя, па сутнасці, адбываецца ў сям’і. Тут мы звычайна атрымліваем першае абвяшчэнне веры на мове – нават на дыялекце – нашых бацькоў, дзядуляў і бабуляў .Таму тыя, хто выконвае служэнне ў Касцёле, павінны злучыць свой уклад з мудрасцю ўсяго вернага народа Божага ў супрацоўніцтве, якое для супольнасці з’яўляецца неабходным. Гэта першая прыкмета фармацыі, зразуметай у сінадальным сэнсе.

d) У хрысціянскім утаямнічанні мы знаходзім параду, як ісці па шляху фармацыі. У цэнтры хрысціянскай фармацыі ляжыць паглыбленне керыгмы, гэта значыць сустрэчы з Езусам Хрыстом, якая прапануе нам дар новага жыцця. Катэхумэнальная логіка нагадвае нам, што ўсе мы грэшнікі, пакліканыя да святасці. Вось чаму мы ідзём да асабістага навяртання, якое даводзіцца да выканання ў сакрамэнце паяднання. Вось чаму, падмацаваныя вялікай колькасцю сведак, мы жывім жаданне святасці.

e) Сфер, у якіх адбываецца фармацыя Божага народа, шмат. Акрамя тэалагічнай фармацыі, асамблея папрасіла арганізаваць навучанне спецыфічным навыкам: практыцы сумеснай адказнасці, слухання і распазнавання; вядзенню экуменічнага і міжрэлігійнага дыялогу, служэнню самым убогім і клопату пра наш агульны дом; удзелу ў якасці «лічбавых місіянераў», спрыянню працэсам распазнавання, размове ў Духу, дасягненню кансэнсусу і вырашэнню канфліктаў. Асаблівую ўвагу трэба надаваць таксама катэхетычнай фармацыі дзяцей і моладзі, якая павінна прадугледжваць актыўны ўдзел супольнасці.

f) Фармацыя дзеля сінадальнага Касцёла павінна адбывацца сінадальна: увесь Божы народ фарміруецца разам, здзяйсняючы сумеснае падарожжа. Існуе неабходнасць пераадолець мысленне «дэлегавання», якое прысутнічае ў многіх сферах пастырскага служэння. Фармацыя ў сінадальным ключы павінна даць Божаму народу магчымасць паўнавартасна рэалізаваць сваё пакліканне хросту ў сям’і, на працоўным месцы, у касцёльнай, сацыяльнай і інтэлектуальнай сферах. Яна заклікана даць магчымасць кожнаму чалавеку актыўна ўдзельнічаць у місіі Касцёла ў адпаведнасці са сваімі харызмамі і пакліканнем.

**Пытанні для разгляду**

g) Мы рэкамендуем распачаць працу па адукацыі ў сферы ўзаемаадносін і сексуальнай адукацыі, каб суправаджаць маладых людзей па меры іх сталення ў асабістай і сексуальнай ідэнтычнасці і падтрымліваць сталенне тых, хто пакліканы да цэлібату і манаскай чыстасці. Фармацыя ў гэтых сферах з’яўляецца неабходнай дапамогай на ўсіх этапах жыцця.
h) Важна паглыбляць дыялог паміж гуманітарнымі навукамі, асабліва псіхалогіяй і тэалогіяй, для разумення чалавечага вопыту, каб гэтыя падыходы не проста ставіліся побач, а інтэграваліся ў больш спелы сінтэз.
i) Божы народ павінен быць шырока прадстаўлены ў праграмах фармацыі для пасвячанага служэння, як ужо патрабавалі папярэднія сіноды. Таму нам патрэбны дбайны перагляд праграм фармацыі з асаблівай увагай на тое, як мы можам паспрыяць унёску жанчын і сем’яў у іх.
j) Канферэнцыі біскупаў заахвочваюцца да сумеснай працы на рэгіянальным узроўні для стварэння культуры фармацыі і навучання на працягу ўсяго жыцця з выкарыстаннем усіх даступных рэсурсаў, у тым ліку развіцця лічбавых варыянтаў.

**Прапановы**

k) У святле сінадальнасці мы прапануем аддаваць перавагу праграмам, распрацаваным і прызначаным для сумеснай фармацыі ўсяго Божага народа (свецкіх, кансэкраваных і пасвячаных служыцеляў). Дыяцэзіі павінны імкнуцца заахвочваць гэтыя праекты ў мясцовых Касцёлах. Мы заахвочваем Канферэнцыі біскупаў працаваць разам на рэгіянальным узроўні для стварэння культуры пастаяннай фармацыі з выкарыстаннем усіх даступных рэсурсаў, у тым ліку развіцця лічбавых варыянтаў.
l) Пэўная колькасць членаў Божага народа павінна быць прадстаўлена ў праграмах фармацыі для пасвячаоных служэнняў, як ужо прасілі папярэднія сіноды. Асаблівае значэнне мае ўдзел жанчын.
m) Неабходна прымяняць адпаведныя стандарты і працэсы адбору кандыдатаў для пасвячанага служэння, каб гарантаваць выкананне патрабаванняў прапедэўтычнай праграмы для семінарыстаў.
n) Фармацыя пасвячаных служыцеляў павінна складацца так, каб яна адпавядала сінадальнаму Касцёлу ў розных мясцовых кантэкстах. Перш чым рушыць на пэўныя шляхі, кандыдаты павінны мець значны, хаця і першапачатковы, досвед жыцця ў хрысціянскай супольнасці. Фармацыя не павінна ствараць штучнага асяроддзя, асобнага ад звычайнага жыцця вернікаў. Захоўваючы патрабаванні фармацыі да служэння, мы можам выхоўваць сапраўдны дух служэння Божаму народу ў прапаведаванні, цэлебрацыі сакрамэнтаў і дабрачыннасці. Гэта можа запатрабаваць перагляду *Ratio fundamentalis* для прэзбітэраў і пастаянных дыяканаў.
o) Падчас падрыхтоўкі да наступнай сесіі асамблеі неабходна правесці кансультацыю з адказнымі за першасную і пастаянную фармацыю прэзбітэраў, каб ацаніць, як успрымаецца сінадальны працэс, і прапанаваць змены, якія будуць садзейнічаць ажыццяўленню ўлады ў стылі, які адпавядае сінадальнаму Касцёлу.

## 15. Касцёльнае распазнаванне і адкрытыя пытанні

**Агульныя пункты погляду**

a) Вопыт размовы ў Духу ўзбагаціў усіх удзельнікаў. Яны высока ацанілі наш стыль зносін, які аддаваў перавагу свабодзе ў выказванні сваіх поглядаў і слуханні адзін аднаго. Гэта дазволіла нам пазбегнуць занадта хуткага пераходу да дыскусіі, заснаванай на паўтарэнні

нашых уласных пазіцый без папярэдняга прыслухоўвання да аргументаў, якія падтрымліваюць пазіцыю іншых.

b) Гэты базавы падыход ствярае кантэкст, які дазваляе ўважліва разглядаць пытанні, якія выклікаюць спрэчкі ў Касцёле, такія як, сярод іншага, антрапалагічныя наступствы лічбавых тэхналогій і штучнага інтэлекту, ненасілле і законная самаабарона, пытанні, звязаныя са служэннем, пытанні, звязаныя з сексуальнасцю і цялеснасцю.

c) Каб развіць сапраўднае касцёльнае распазнаванне ў гэтых і іншых сферах, неабходна падысці да гэтых пытанняў у святле Божага слова і вучэння Касцёла, з належнай інфармаванасцю і разважаннем. Каб пазбегнуць паўтарэння пустых формул, мы павінны даць магчымасць дыялогу з удзелам гуманітарных і сацыяльных навук, а таксама філасофскіх і тэалагічных разважанняў.

d) У цэнтры многіх з гэтых супярэчлівых спраў ляжыць пытанне пра ўзаемасувязь паміж любоўю і праўдай і пра тое, як гэта ўплывае на многія спрэчныя пытанні. Перш чым разглядаць гэтыя адносіны як выклік, насамрэч трэба разглядаць іх як ласку, аб'яўленую ў Хрысце. Бо Езус споўніў абяцанне, дадзенае ў псалмах: «Любоў і праўда сустрэнуцца, справядлівасць і спакой пацалуюцца, вернасць вырасце з зямлі, а справядлівасць будзе пазіраць з нябёсаў» (Пс 85, 11–12).

e) Некалькі евангельскіх урыўкаў паказваюць, што Езус сустракае людзей ва ўнікальнасці іх асабістай гісторыі і сітуацыі. Ён ніколі не зыходзіць з пункту гледжання прадузятасці ці ярлыкоў. Ён пачынае з сапраўднасці адносін, якім аддае сябе ўсім сэрцам, нават цаной неразумення і непрыняцця. Езус заўсёды чуе просьбу патрабуючых аб дапамозе, нават у сітуацыях, калі яна застаецца нявыказанай. Ён робіць жэсты, якія выказваюць любоў і вяртаюць давер. Сваёй прысутнасцю Ён робіць магчымым новае жыццё: тыя, хто сустракае Яго, адыходзяць перамененымі. Гэта адбываецца таму, што праўда, носьбітам якой з'яўляецца Езус, гэта не ідэя, а сама прысутнасць Бога сярод нас; і любоў, з якой Ён дзейнічае, гэта не проста пачуццё, а справядлівасць Валадарства, якая змяняе гісторыю.

f) Мы можам падтрымаць іншых толькі тады, калі самі перажываем навяртанне, асабістае і супольнае. Цяжкасці, з якімі мы сутыкаемся, калі пераводзім яснае евангельскае бачанне Езуса ў пастырскі выбар, з'яўляюцца прыкметай нашых праблем з тым, каб жыць паводле Евангелля. Калі мы выкарыстоўваем вучэнне жорстка і з асуджэннем, мы здраджваем Евангеллю; калі мы практыкуем танную міласэрнасць, мы не перадаём любоў Бога. Адзінства праўды і любові азначае несці цяжкасці іншых, нават робячы іх сваімі, як гэта адбываецца паміж братамі і сёстрамі. Але гэтай еднасці можна дасягнуць толькі цярпліва ідучы шляхам суправаджэння.

g) Пэўныя пытанні, такія як праблемы ідэнтычнасці і сексуальнасці, заканчэння жыцця, складаных шлюбных сітуацый, а таксама этычныя пытанні, звязаныя са штучным інтэлектам, выклікаюць спрэчкі не толькі ў грамадстве, але і ў Касцёле, бо ўздымаюць новыя пытанні. Часам антрапалагічныя катэгорыі, якія мы распрацавалі, не здольныя зразумець складанасці элементаў, якія вынікаюць з вопыту або ведаў у галіне навукі, і патрабуюць большай дакладнасці і далейшага вывучэння. Важна знайсці час, неабходны для гэтага разважання, і ўкласці ў яго ўсе свае сілы, не паддаючыся спрошчаным суджэнням, якія шкодзяць людзям і целу Касцёла. Вучэнне Касцёла ўжо дае адчуванне напрамку ў многіх з гэтых пытанняў, але гэтае вучэнне, відавочна, усё яшчэ патрабуе пераводу ў пастырскую практыку. Нават там, дзе патрабуецца дадатковае праясненне, дзеянні Езуса, засвоеныя ў малітве і навяртанні сэрца, паказваюць нам шлях наперад.

**Пытанні для разгляду**

h) Неабходна працягваць касцёльнае разважанне над першапачатковым перапляценнем любові і праўды, якія вынікаюць з хрысталагічнага аб'яўлення, каб касцёльная практыка была вернай гэтым вытокам.

i) Мы заахвочваем экспертаў у розных галінах спалучаць свае веды з асабістай духоўнасцю, каб тое, што яны прапануюць, было сапраўдным касцёльным служэннем. У гэтым кантэксце сінадальнасць азначае гатоўнасць думаць разам у служэнні місіі і ў розных умовах, але з агульным пачуццём мэты.

j) Мы ўбачылі патрэбу ў разважанні над умовамі, якія робяць магчымымі тэалагічныя і культурныя даследаванні, што бяруць за адпраўную кропку штодзённы досвед святога Божага народа і ставяць яго яму на службу.

**Прапановы**

k) Мы прапануем развіваць ініцыятывы, якія дазваляюць сумесна распазнаваць спрэчныя дактрынальныя, пастырскія і этычныя пытанні ў святле Божага слова, вучэння Касцёла, тэалагічных разважанняў і ацэнкі сінадальнага вопыту. Гэта можа быць дасягнута праз паглыбленыя дыскусіі паміж экспертамі з рознымі навыкамі і вопытам у інстытуцыйных умовах, якія абараняюць канфідэнцыяльнасць і спрыяюць адкрытай дыскусіі. Калі гэта неабходна, у іх павінны таксама ўдзельнічаць людзі, якіх непасрэдна закранаюць пытанні, якія разглядаюцца. Такія ініцыятывы павінны быць распачаты да наступнай сесіі асамблеі.

## 16. У напрамку Касцёла, які слухае і суправаджае

**Агульныя пункты погляду**

a) На працягу першых двух гадоў сінадальнага падарожжа, у тым ліку нашай асамблеі, слуханне – гэта слова, якое найлепш выяўляе наш вопыт. Гэта слуханне дадзенае і атрыманае. Слуханне – гэта глыбока чалавечая рэальнасць, дынаміка ўзаемнасці, у якой кожны робіць уклад у шлях іншага, атрымліваючы ўклад у свой уласны.

b) Многія з тых, хто ўдзельнічаў у сінадальным працэсе на мясцовым узроўні, і асабліва тыя, хто пацярпеў ад маргіналізацыі ў Касцёле ці ў грамадстве, былі вельмі здзіўлены запрашэннем выступіць і быць пачутымі ў Касцёле і Касцёлам. Быць уважліва выслуханым – гэта вопыт афірмацыі і прызнання годнасці, а таксама магутны спосаб прыцягнуць людзей і супольнасці.

c) Каб паставіць Езуса ў цэнтр нашага жыцця, патрэбна некаторае самаадрачэнне. З гэтага пункту гледжання слухаць азначае быць гатовым адысці з цэнтра, каб пакінуць месца для іншага. Мы зведалі гэта ў дынаміцы размоў у Духу. Гэта патрабавальнае аскетычнае практыкаванне, якое абавязвае кожнага чалавека прызнаць уласную абмежаванасць і неаб'ектыўнасць свайго пункту гледжання. Дзякуючы гэтаму ён адкрывае магчымасць слухаць голас Духа Божага, які прамаўляе да тых, хто знаходзіцца па-за межамі касцёльнай супольнасці, і можа распачаць шлях перамен і навяртання.

d) Слуханне мае хрысталагічнае значэнне; гэта азначае прыняць стаўленне Езуса да людзей, з якімі Ён сустракаўся (пар. Флп 2, 6-11). Яно таксама мае касцёльнае значэнне, бо менавіта Касцёл слухае праз дзеянні ахрышчаных, якія дзейнічаюць не толькі ад свайго імя, але і ад імя супольнасці.

e) Падчас сінадальнага працэсу Касцёл сустракаў шмат людзей і груп, якія прасілі, каб іх слухалі і суправаджалі. У першую чаргу мы згадваем моладзь, просьба якой аб слуханні і

суправаджэнні знайшла моцны рэзананс на прысвечаным ім сінодзе (2018 г.) і на гэтай асамблеі, пацвярджаючы неабходнасць выбару на карысць моладзі.

f) Касцёл павінен з асаблівай увагай і чуласцю прыслухоўвацца да галасоў ахвяр і тых, хто перажыў сексуальныя, духоўныя, эканамічныя, інстытуцыйныя злоўжыванні, злоўжыванні ўладай і сумленнем з боку членаў духавенства або асоб, прызначаных Касцёлам. Сапраўднае слуханне з'яўляецца фундаментальным элементам шляху да аздараўлення, пакаяння, справядлівасці і прымірэння.

g) Асамблея выказвае сваю блізкасць і падтрымку ўсім тым, хто прымае самотнасць як выбар, зроблены ў вернасці Традыцыі і Настаўніцтву Касцёла адносна шлюбу і сексуальнай этыкі, які яны прызнаюць крыніцай жыцця. Мы заахвочваем хрысціянскія супольнасці быць побач з імі, слухаць іх і суправаджаць іх у іх абавязацельствах.

h) Людзі, якія адчуваюць сябе маргіналізаванымі або выключанымі з Касцёла з-за свайго шлюбнага статусу, ідэнтычнасці або сексуальнасці, таксама рознымі спосабамі просяць, каб іх слухалі і суправаджалі. На асамблеі адчувалася глыбокае пачуццё любові, міласэрнасці і спачування да тых, хто пацярпеў або адчувае сябе пакрыўджаным ці занядбаным Касцёлам, хто хоча мець месца, якое можна было б назваць «домам», дзе яны могуць адчуваць сябе ў бяспецы, быць пачутымі і паважанымі без страху адчуць сябе асуджанымі. Слуханне з'яўляецца неабходнай умовай для сумеснага крочання ў пошуках Божай волі. Асамблея паўтарае, што хрысціяне павінны заўсёды паважаць годнасць кожнага чалавека.

i) Людзі, якія пакутуюць ад розных форм беднасці, выключэння і маргіналізацыі ў нашым няроўным грамадстве, таксама звяртаюцца да Касцёла ў пошуках любові, выслухоўвання і суправаджэння. Такое слуханне дазваляе Касцёлу зразумець рэчаіснасць беднасці і маргіналізацыі, а таксама наблізіцца ў сяброўстве да тых, хто пакутуе. Што важна, гэта таксама дазваляе, каб тыя, хто пакутуе, евангелізавалі Касцёл. Слуханне іх дазваляе Касцёлу зразумець іх пункт гледжання і канкрэтна стаць на іх бок, каб яны маглі яго евангелізаваць. Выказваем падзяку і заахвочванне ўсім, хто займаецца паслугай выслухоўвання і суправаджэння зняволеных. Яны павінны асабліва перажываць міласэрную любоў Пана і не адчуваць сябе ізаляванымі ад супольнасці. Ад імя Касцёла яны рэалізуюць словы Пана: «Я быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне» (Мц 25, 36).

j) Многія людзі адчуваюць стан адзіноты, які часта блізкі да пакінутасці. Састарэлыя і хворыя часта застаюцца ў грамадстве нябачнымі. Заахвочваем парафіі і хрысціянскія супольнасці быць побач з імі і слухаць іх. Справы міласэрнасці, натхнёныя евангельскімі словамі «Я быў хворы, і вы адведалі Мяне» (Мц 25, 36), маюць глыбокае значэнне для людзей, якія ўдзельнічаюць у іх, і для ўмацавання больш шырокіх сувязяў у супольнасці.

k) Нарэшце, Касцёл хоча слухаць усіх, а не толькі тых, каму лягчэй за ўсё дамагчыся, каб іх голас быў пачуты. У некаторых рэгіёнах па культурных і сацыяльных прычынах членам пэўных груп, такіх як моладзь, жанчыны і меншасці, можа быць цяжэй свабодна выказваць сваё меркаванне ў грамадскай ці касцёльнай прасторы. Жыццё пад рэпрэсіўнымі і дыктатарскімі рэжымамі таксама размывае гэтую свабоду. Тое самае можа адбыцца, калі ажыццяўленне ўлады ў хрысціянскай супольнасці становіцца прыгнятальным, а не вызваленчым.

**Пытанні для разгляду**

l) Слуханне патрабуе безумоўнага прыняцця. Гэта не азначае ісці на кампраміс з абвяшчэннем Евангелля або падтрымліваць якую-небудзь прапанаваную думку або пазіцыю. Езус адкрываў новыя гарызонты і шляхі для людзей, якіх безумоўна слухаў; і каб дзяліцца Добрай Навіной збаўлення з тымі, каго сустракаем, мы пакліканы рабіць тое ж самае.

m) Шырока распаўсюджаныя ў многіх частках свету невялікія хрысціянскія супольнасці выхоўваюць практыку слухання ахрышчаных і сярод ахрышчаных. Мы закліканы павялічыць іх патэнцыял, у прыватнасці, даследуючы, як яны могуць быць адаптаваны да гарадскога кантэксту.

**Прапановы**

n) Што трэба змяніць, каб тыя, хто адчувае сябе выключанымі, сустрэліся з больш гасцінным Касцёлам? Слуханне і суправаджэнне з'яўляюцца формай касцёльнага дзеяння, а не толькі дзеяннем асобных людзей. Таму яны павінны знайсці месца ў звычайным пастырскім планаванні і дзеючай структуры хрысціянскіх супольнасцяў на розных узроўнях, з выкарыстаннем у поўнай меры духоўнага суправаджэння. Сінадальны Касцёл павінен быць Касцёлам, які слухае, і гэтае абавязацельства павінна быць ператворана ў практыку.

o) Мы не пачынаем гэтую працу з нуля. Шматлікія ўстановы і структуры выконваюць каштоўную задачу слухання. *Caritas* у тым ліку ажыццяўляе суправаджэнне сярод самых бедных, а таксама сярод мігрантаў і бежанцаў. Ёсць і многія іншыя кантэксты суправаджэння, звязаныя з манаскім жыццём або свецкімі асацыяцыямі. Больш цеснае злучэнне іх працы з мясцовай касцельнай супольнасцю дазваляе разглядаць гэтую працу як частку жыцця ўсёй супольнасці, а не як дэлегаванае заданне.

p) Тыя, хто выконвае паслугу слухання і суправаджэння ў розных яе формах, патрабуюць адпаведнай падрыхтоўкі з улікам вопыту тых, з кім яны кантактуюць. Яны таксама павінны адчуваць падтрымку грамадства. Са свайго боку, супольнасці павінны ў поўнай меры ўсвядоміць значэнне гэтай паслугі, якая выконваецца ад іх імя, і прыняць плён гэтага слухання. Мы прапануем заснаваць паслугу слухання і суправаджэння, каб надаць большае значэнне гэтаму служэнню. Яна павінна караніцца ў хросце і адаптавацца да розных кантэкстаў. Спосаб удзялення гэтай паслугі павінен спрыяць удзелу супольнасці.

q) SECAM (Сімпозіум канферэнцый біскупаў Афрыкі і Мадагаскара) заахвочваецца да спрыяння тэалагічнаму і пастырскаму распазнаванню ў пытанні палігаміі і суправаджэнні людзей у палігамных саюзах, якія прыходзяць да веры.

## 17. Місія ў лічбавым асяроддзі

**Агульныя пункты погляду**

a) Лічбавая культура ўяўляе сабой фундаментальную змену ў тым, як мы ўспрымаем рэчаіснасць і, адпаведна, ставімся да саміх сябе, адзін да аднаго, да нашага атачэння і нават да Бога. Лічбавае асяроддзе змяняе нашы працэсы навучання, а таксама наша ўспрыманне часу, прасторы, нашага цела, міжасабовых адносін і фактычна большай часткі нашага спосабу мыслення. Дуалізм паміж рэальным і віртуальным не апісвае адэкватна рэальнасці і вопыту людзей, асабліва самых маладых, так званых «лічбавых тубыльцаў».

b) Такім чынам, лічбавая культура з'яўляецца не столькі асобнай сферай місіі, колькі важным вымярэннем сведчання Касцёла ў сучаснай культуры. Таму яна мае асаблівае значэнне ў сінадальным Касцёле.

c) Місіянеры заўсёды ішлі з Хрыстом да новых рубяжоў, а Дух Святы падштурхоўваў і апярэджваў іх. Нам належыць дасягнуць сучаснай культуры ва ўсіх прасторах, дзе людзі шукаюць сэнсу і любові, у тым ліку ў тых, у якія яны ўваходзяць праз мабільныя тэлефоны і планшэты.

d) Мы не можам евангелізаваць лічбавую культуру, не зразумеўшы яе папярэдне. Моладзь, а сярод яе семінарысты, маладыя святары і маладыя манаскія асобы, якія часта маюць

глыбокі і непасрэдны досвед, найбольш прыдатныя для выканання місіі Касцёла ў лічбавым асяроддзі, а таксама для суправаджэння астатніх членаў супольнасці, у тым ліку пастыраў, пры знаёмстве з яе дынамікай.

e) У межах сінадальнага працэсу ініцыятывы «Лічбавага сінода» (праект «Касцёл слухае цябе») паказваюць патэнцыял лічбавага асяроддзя, якое разглядаецца ў місійным ключы, крэатыўнасць і шчодрасць тых, хто ў ім удзельнічае, і важнасць забеспячэння ім падрыхтоўкі, суправаджэння і магчымасці для асабістага абмеркавання і супрацоўніцтва.

**Пытанні для разгляду**

f) Інтэрнэт усё больш прысутнічае ў жыцці дзяцей і сем’яў. Нягледзячы на тое, што ён мае вялікі патэнцыял для паляпшэння жыцця людзей, ён таксама можа прычыняць шкоду і траўмы, напрыклад, праз запалохванне, дэзінфармацыю, сексуальную эксплуатацыю і залежнасць. Існуе тэрміновая неабходнасць разгледзець, як хрысціянская супольнасць можа падтрымаць сем’і ў забеспячэнні таго, каб інтэрнэт-прастора была не толькі бяспечнай, але і духоўна жыватворнай.

g) Ёсць шмат каштоўных і карысных анлайн-ініцыятыў, звязаных з Касцёлам, якія забяспечваюць выдатную катэхізацыю і фармацыю веры. На жаль, ёсць таксама сайты, дзе пытанні веры разглядаюцца павярхоўна, палярызавана і нават з нянавісцю. Як Касцёл і асобныя лічбавыя місіянеры мы абавязаны спытаць сябе, як мы можам гарантаваць, што наша прысутнасць у інтэрнэце будзе вопытам росту для тых, з кім мы маем зносіны.

h) Апостальскія анлайн-ініцыятывы маюць ахоп і сферу дзеяння, якія выходзяць за рамкі традыцыйна зразуметых тэрытарыяльных межаў. Гэта выклікае важныя пытанні аб тым, як іх можна рэгуляваць і якая касцельная ўлада павінна несці адказнасць за нагляд.

i) Мы таксама павінны ўлічваць наступствы новага лічбавага місійнага фронту для аднаўлення існуючых парафіяльных і дыяцэзіяльных структур. У свеце, які становіцца ўсё больш лічбавым, як нам не апынуцца ў пастцы мыслення, якое імкнецца толькі захаваць тое, што мы ўжо робім, і замест гэтага вызваліць новую энергію для новых форм місіі?

j) Пандэмія COVID-19 стымулявала шэраг крэатыўных душпастырскіх ініцыятыў у інтэрнэце для змяншэння наступстваў ізаляцыі і адзіноты, якія адчуваюць асабліва пажылыя і ўразлівыя члены супольнасці. Каталіцкія навучальныя ўстановы таксама эфектыўна выкарыстоўвалі інтэрнэт-платформы, каб працягваць прапаноўваць фармацыю і катэхізацыю падчас каранціну. Нам неабходна ацаніць, чаму навучыў нас гэты вопыт і якія трывалыя перавагі могуць існаваць для місіі Касцёла ў лічбавым асяроддзі.

k) Нягледзячы на тое, што маладыя людзі шукаюць прыгажосці, многія з іх, аддаўшы перавагу інтэрнэт-прасторы, пакінулі фізічную прастору Касцёла, куды мы працягваем іх запрашаць. Гэта мае наступствы для таго, якім чынам мы спрабуем зацікавіць іх і прапанаваць ім фармацыю і катэхізацыю. Гэта тое, што трэба разглядаць з пастырскага пункту гледжання.

**Прапановы**

l) Мы павінны стварыць магчымасці для прызнання, фарміравання і суправаджэння тых, хто ўжо працуе ў якасці лічбавых місіянераў, а таксама садзейнічаць наладжванню сетак паміж імі.

m) Важна ствараць сумесныя сеткі інфлюэнсераў, куды ўваходзяць людзі іншых рэлігій або тыя, хто можа не вызнаваць ніякай веры, але жадае супрацоўнічаць у агульных справах для спрыяння чалавечай годнасці, справядлівасці і клопату пра наш агульны дом.

## 18. Структуры для ўдзелу

### Агульныя пункты погляду

a) Як члены вернага Божага народа усе ахрышчаныя нясуць суадказнасць за місію, кожны ў адпаведнасці са сваім пакліканнем, кампетэнцыяй і вопытам. Таму ўсе робяць уклад у вынаходніцтва і распазнаванне крокаў па рэфармаванні хрысціянскіх супольнасцей і Касцёла ў цэлым. Тым самым Касцёл адчувае «салодкую і суцяшальную радасць евангелізацыі». Мэтай сінадальнасці ва ўладкаванні і функцыянаванні органаў, у якіх яна фарміруецца, з’яўляецца місія. Суадказнасць прызначана для місіі. Гэта сведчыць аб тым, што мы сапраўды сабраліся ў імя Езуса; гэта вызваляе арганізацыі ўдзелу ад бюракратычных абмежаванняў і свецкай логікі ўлады і робіць сходы плённымі.

b) У святле нядаўняга навучання Касцёла (у прыватнасці, *Lumen gentium* і *Evangelii gaudium*), гэтая суадказнасць усіх удзельнікаў місіі павінна быць крытэрыем, які ляжыць у аснове структуравання хрысціянскіх супольнасцей і ўсяго мясцовага Касцёла з усімі яго паслугамі, ва ўсіх яго ўстановах, у кожным з яго пастырскіх органаў (пар. 1 Кар 12, 4–31). Належнае прызнанне місіі свецкіх у свеце не можа быць падставай для ўскладання клопату аб хрысціянскай супольнасці толькі на біскупаў і прэзбітэраў.

c) Аўтарытэтам ў поўным сэнсе з’яўляецца Божае слова, якое павінна натхняць кожнае пасяджэнне органаў удзелу, кожную кансультацыю і кожны працэс прыняцця рашэнняў. Каб гэта адбылося, неабходна, каб на кожным узроўні сустрэча чэрпала сэнс і моц з Эўхарыстыі і адбывалася ў святле слова, якое чуюць і якім дзеляцца ў малітве.

d) Склад розных рад для распазнавання і прыняцця рашэнняў у сінадальнай місійнай супольнасці павінен прадугледжваць прысутнасць мужчын і жанчын, якія маюць апостальскі настрой, які вылучаецца не частай прысутнасцю ў касцёле, а сапраўдным евангельскім сведчаннем у звычайным жыцці. Божы народ становіцца тым больш місійным, калі можа зрабіць так, каб галасы тых, хто ўжо жыве місіяй, насяляючы свет і яго перыферыю, гучалі ў ім самім, у тым ліку ў арганізацыях удзелу.

### Пытанні для разгляду

e) У святле таго, чым мы падзяліліся, важна спытаць, як мы можам спрыяць удзелу ў розных радах, калі многія адчуваюць, што не спраўляюцца з гэтай задачай. Сінадальнасць узрастае, калі кожны член удзельнічае ў працэсах і прыняцці рашэнняў дзеля місіі Касцёла. У гэтым сэнсе нас падбадзёрваюць шматлікія малыя хрысціянскія супольнасці ў Касцёлах, што развіваюцца, якія пражываюць штодзённасць вакол Божага слова і Эўхарыстыі.

f) У *Amoris laetitia* Папа Францішак даручыў Касцёлу ўнесці змены ў склад органаў удзелу. Гэтае заданне нельга адкладаць далей. Удзел ахрышчаных мужчын і жанчын, якія жывуць у складаных эмацыйных і сужэнскіх сітуацыях, «можа выяўляцца ў розных касцёльных паслугах, таму трэба распазнаць, якія з розных форм выключэння, практыкаваных сёння ў літургічнай, пастырскай, адукацыйнай, а таксама ў інстытуцыйнай сферы, можна адмяніць» (299). Гэтае распазнаванне таксама тычыцца іх выключэння з органаў удзелу парафіяльных і дыяцэзіяльных супольнасцей, як гэта адбываецца ў некаторых мясцовых Касцёлах.

g) З пункту гледжання ўнікальнасці касцёльнай еднасці як мы можам злучыць кансультацыйны і дарадчы аспекты сінадальнасці? Улічваючы разнастайнасць харызматычных і службовых дароў Божага народа, як мы можам інтэграваць задачы кансультавання, распазнавання і прыняцця рашэнняў у розныя органы ўдзелу?

**Прапановы**

h) Зыходзячы з разумення Божага народа як актыўнага суб'екта місіі евангелізацыі, прапануем заканадаўча замацаваць абавязковы характар душпастырскіх рад у хрысціянскіх супольнасцях і мясцовых Касцёлах. Было б таксама пажадана ўзмацніць органы ўдзелу належнай прысутнасцю свецкіх, прызнаючы ролю, якую яны могуць адыгрываць у распазнаванні рашэнняў у сілу свайго хросту.

i) Органы ўдзелу ўяўляюць сабой першую інстанцыю, у якой можна адчуць падсправаздачнасць тых, хто нясе адказнасць. Нягледзячы на тое, што мы цёпла вітаем і падтрымліваем іх абавязацельствы, яны, у сваю чаргу, запрашаюцца практыкаваць культуру падсправаздачнасці перад супольнасцю, дэлегатамі якой з'яўляюцца.

## 19. Групы Касцёлаў у супольнасці паўсюднага Касцёла

**Агульныя пункты погляду**

a) Святы Дух багата размяркоўвае свае дары для агульнага дабра, і таму мы перакананыя, што кожны Касцёл у супольнасці паўсюднага Касцёла можа прапанаваць шмат. Калі мы разглядаем Касцёл як цела Хрыста, нам лягчэй зразумець, што розныя члены ўзаемазалежныя і маюць аднолькавае жыццё: «Калі пакутуе адзін член, пакутуюць з ім усе члены; калі праслаўляецца адзін член, з ім радуюцца ўсе члены» (1 Кар 12, 26). Таму мы жадаем развіваць духоўныя адносіны, якія вынікаюць з гэтага светапогляду: пакору і шчодрасць, павагу і дзяленне. Важнай з'яўляецца таксама гатоўнасць узрастаць ва ўзаемным пазнанні і рыхтаваць неабходныя структуры, каб абмен духоўнымі багаццямі, місійным вучнёўствам і матэрыяльнымі дабротамі стаў канкрэтнай рэальнасцю.

b) Пытанне аб'яднання мясцовых Касцёлаў аказалася фундаментальным для поўнага ажыццяўлення сінадальнасці ў Касцёле. Адказваючы на пытанне аб тым, як уладкаваць сітуацыі сінадальнасці і калегіяльнасці з удзелам груп мясцовых Касцёлаў, асамблея пагадзілася з важнасцю касцёльнага распазнавання, якое здзяйснялася Канферэнцыямі біскупаў і кантынентальнымі асамблеямі для належнага правядзення першай фазы сінадальнага працэсу.

c) Сінадальны працэс паказаў, што органы, прадугледжаныя Кодэксам кананічнага права і Кодэксам канонаў Усходніх Касцёлаў, выконваюць сваю функцыю больш эфектыўна, калі мясцовыя Касцёлы іх разумеюць. Той факт, што Касцёл (*Ecclesia tota*) з'яўляецца супольнасцю Касцёлаў, патрабуе ад кожнага біскупа больш непасрэднага і абавязковага выканання абавязку апекі над усімі Касцёламі (*sollicitudo omnium Ecclesiarum*) як канстытутыўнага аспекту яго служэння ў якасці пастыра Касцёла.

d) Канферэнцыі біскупаў адыгралі вырашальную ролю на першым этапе сінадальнага працэсу. Гэты працэс выявіў неабходнасць сінадальнасці і калегіяльнасці на кантынентальным узроўні. Органы, якія дзейнічаюць на гэтых узроўнях, спрыяюць ажыццяўленню сінадальнасці, паважаючы мясцовыя рэаліі і працэсы інкультурацыі. Асамблея выказала ўпэўненасць, што гэтымі сродкамі будзе пераадолена рызыка аднастайнасці і цэнтралізацыі ў кіраванні Касцёлам.

**Пытанні для разгляду**

e) Перш чым ствараць новыя касцёльныя структуры, трэба ўмацаваць і ажывіць існуючыя. Існуе таксама патрэба ў эклезіялагічным і кананічным вывучэнні наступстваў рэформы, звязанай з групамі Касцёлаў, каб яны маглі больш поўна набыць сінадальны характар.

f) Улічваючы сінадальную практыку Касцёла першага тысячагоддзя, мы прапануем правесці даследаванне, якое вывучае, як у сучасным кананічным парадку могуць быць адноўлены старажытныя інстытуты і як іх можна гарманізаваць з новастворанымі, такімі як Канферэнцыі біскупаў.

g) Дактрынальная і юрыдычная прырода Канферэнцый біскупаў патрабуе далейшага вывучэння з прызнаннем магчымасці калегіяльнай дзейнасці, у тым ліку у пытаннях веравучэння, якія ўзнікаюць на мясцовым узроўні, што зноў адкрые разважанне над motu proprio *Apostolos suos*.

h) Ці могуць каноны, якія адносяцца да партыкулярных сабораў (пленарнага і правінцыяльнага), быць перагледжаны з мэтай таго, каб павялічыць удзел Божага народа, па прыкладзе дыспенсацыі, атрыманай на нядаўнім Пленарным саборы Аўстраліі?

**Прапановы**

i) Сярод структур, ужо прадугледжаных кодэксам, неабходна аднавіць і ўмацаваць ролю касцёльнай правінцыі або мітраполіі як месца еднасці для партыкулярных Касцёлаў на іх тэрыторыі.

j) Адпаведныя ўлады павінны ажыццяўляць сінадальнасць на рэгіянальным, нацыянальным і кантынентальным узроўнях у адпаведнасці з думкамі, якія з’явіліся ў дачыненні да груп Касцёлаў.

k) Там, дзе гэта неабходна, мы прапануем стварыць міжнародныя касцёльныя правінцыі для карысці біскупаў, якія не належаць ні да адной Канферэнцыі біскупаў, і для спрыяння еднасці паміж Касцёламі праз нацыянальныя межы.

l) У краінах лацінскага абраду, дзе таксама існуе іерархія Усходніх Каталіцкіх Касцёлаў, мы рэкамендуем уключаць усходніх біскупаў у нацыянальныя Канферэнцыі біскупаў, пакідаючы некранутай іх кіраўнічую аўтаномію, устаноўленую іх уласным кодэксам.

m) Неабходна распрацаваць кананічную канфігурацыю кантынентальных асамблей, якія, паважаючы асаблівасці кожнага кантынента, належным чынам улічвалі б удзел Канферэнцый біскупаў і Касцёлаў з іх уласнымі дэлегатамі, якія прадстаўляюць разнастайнасць Божага народа.

## 20. Сінод біскупаў і касцёльныя асамблеі

**Агульныя пункты погляду**

a) Нават калі вопыт «сумеснага крочання» быў стомным, асамблея адчувала евангельскую радасць быцця Божым народам. Новы вопыт, атрыманы на гэтым этапе сінадальнага шляху, быў у цэлым вітальны. Да найбольш відавочнага вопыту адносяцца змена правядзення сінода з падзеі ў працэс (як наказвае апостальская канстытуцыя *Episcopalis communio*); прысутнасць іншых членаў, жанчын і мужчын, побач з біскупамі; актыўная прысутнасць брацкіх дэлегатаў; духоўныя рэкалекцыі ў межах падрыхтоўкі да асамблеі; цэлебрацыя Эўхарыстыі ў базіліцы святога Пятра; атмасфера малітвы і метад размовы ў Духу і само размяшчэнне асамблеі ў зале Паўла VI.

b) Асамблея сінода біскупаў, захоўваючы свой выключна біскупскі характар, пры гэтай нагодзе зрабіла адчувальнай уласцівую сувязь паміж сінадальным вымярэннем жыцця Касцёла (удзел усіх), калегіяльным вымярэннем (клопат біскупаў аб усім Касцёле), а таксама першасным вымярэннем (служэнне біскупа Рыма, гаранта еднасці).

c) Сінадальны працэс быў і ёсць часам ласкі, які нас падбадзёрвае. Бог прапануе нам магчымасць перажыць новую культуру сінадальнасці, здольную кіраваць жыццём і місіяй

Касцёла. Аднак мы нагадалі, што недастаткова стварыць структуры сумеснай адказнасці, калі не хапае асабістага навяртання да місійнай сінадальнасці. Сінадальныя працэсы не змяншаюць асабістай адказнасці тых, хто пакліканы да ўдзелу ў іх на ўсіх узроўнях Касцёла ў сілу іх служэння і харызмаў, а яшчэ больш заахвочваюць да яе.

**Пытанні для разгляду**

d) Была ацэнена прысутнасць іншых членаў, акрамя біскупаў, у якасці сведак сінадальнага падарожжа. Аднак застаецца адкрытым пытанне пра ўплыў іх прысутнасці ў якасці паўнапраўных членаў на біскупскі характар асамблеі. Некаторыя бачаць рызыку таго, што канкрэтнае заданне біскупаў не будзе належным чынам зразумета. Неабходна таксама ўдакладніць крытэрыі, паводле якіх члены, якія не з'яўляюцца біскупамі, запрашаюцца ў склад асамблеі.

e) Паведамлялася пра такі вопыт, як першая Лацінаамерыканская і Карыбская касцёльная асамблея ў лістападзе 2021 г., Арганізацыі Божага народа ў Бразіліі і Аўстралійскі пленарны сабор. Застаецца вызначыць і разабрацца, як сумясціць у будучыні сінадальнасць і калегіяльнасць, адрозніваючы (без празмернага раздзялення) уклад усіх членаў Божага народа ў выпрацоўку рашэнняў і канкрэтнае заданне біскупаў. Спалучэнне сінадальнасці, калегіяльнасці і першынства павінна інтэрпрэтавацца не ў статычнай або лінейнай форме, а ў адпаведнасці з дынамічнай цыклічнасцю, у дыферэнцыраванай суадказнасці.

f) У той час як на рэгіянальным узроўні можна думаць аб паслядоўных кроках (касцёльная асамблея, за якой ідзе біскупская асамблея), лічыцца мэтазгодным удакладніць, як гэта можна прапанаваць у дачыненні да Каталіцкага Касцёла ў цэлым. Некаторыя лічаць, што формула, прынятая на гэтай асамблеі, адпавядае гэтай патрэбе; іншыя прапануюць, каб біскупская асамблея ішла пасля касцёльнай асамблеі для завяршэння распазнавання. Тым не менш іншыя аддаюць перавагу таму, каб пакідаць ролю членаў сінадальнай асамблеі за біскупамі.

g) Уклад у працу асамблеі і працэсы сінадальнага Касцёла, зроблены экспертамі з розных дысцыплін, асабліва тэолагамі і кананістамі, таксама мае што прапанаваць.

h) Неабходна будзе таксама паразважаць пра ўзаемадзеянне паміж сінадальным працэсам і камунікацыяй у інтэрнэце і СМК.

**Прапановы**

i) Варта даць ацэнку сінадальным працэсам на ўсіх узроўнях Касцёла.

j) Варта ацаніць плён першай сесіі XVI звычайнай генеральнай асамблеі сінода біскупаў.

# ПРАЦЯГ ПАДАРОЖЖА

*«З чым параўнаем Валадарства Божае?*
*Ці ў якой прыпавесці выявім яго?»* (Мк 4, 30)

Слова Пана мае перавагу над словамі Касцёла. Словы вучняў, нават калі гэта словы сінода, з'яўляюцца толькі рэхам таго, што кажа сам Пан.

Езус, каб абвясціць Божае Валадарства, вырашыў гаварыць у прыпавесцях. Ён знайшоў вобразы, каб гаварыць аб таямніцы Бога ў тэрмінах звычайнага досведу чалавечага жыцця: досведу прыроды, працоўнага месца, элементаў штодзённасці. Тым самым Ён даў нам зразумець, што Божае Валадарства перавышае нас, але не знаходзіцца ад нас далёка. Або мы ўбачым Божае Валадарства ў рэчах гэтага свету, або ніколі яго не ўбачым.

Езус бачыў свой уласны лёс прадстаўленым у зярнятку, якое падае на зямлю, – у чымсьці, што з'яўляецца бязвартасным і нязначным, прызначаным да распаду, але напоўненым дынамізмам жыцця, дынамізмам нястрымным, непрадказальным, пасхальным. Гэта дынамізм, прызначаны даваць жыццё; станавіцца хлебам для многіх; хлебам, якому наканавана стаць Эўхарыстыяй.

Сёння, у культуры, дзе людзі змагаюцца адзін супраць аднаго за панаванне і становяцца апантанымі бачнымі рэчамі, Касцёл пакліканы паўтарыць словы Езуса, каб ажывіць іх ва ўсёй іх сіле.

«З чым параўнаем Валадарства Божае? Ці ў якой прыпавесці выявім яго?» Гэтае пытанне нашага Пана пралівае святло на працу, якая цяпер ляжыць перад намі. Гаворка ідзе не пра тое, каб распыляцца на некалькі франтоў, зводзячы ўсё да логікі эфектыўнасці і працэдурнасці. Наадварот, гаворка ідзе пра тое, каб сярод шматлікіх слоў і прапаноў гэтай справаздачы зразумець тое, што выглядае як маленькае зерне, якое тым не менш нясе будучыню, і ўявіць, як перанесці яго на глебу, якая дазволіць яму расці і развівацца на карысць многіх. «Як гэта станецца?» – спытала сябе Марыя ў Назарэце (Лк 1, 34), пачуўшы слова. Ёсць толькі адзін адказ: заставайцеся ў цені Духа і дазвольце агарнуць сябе Ягонай моцы.

Гледзячы наперад, на перыяд паміж сённяшнім днём і другой сесіяй, давайце падзякуем Пану за пройдзены шлях і за ласкі, якімі Ён яго благаславіў. Наступны этап мы даручаем заступніцтву Найсвяцейшай Панны Марыі, знаку цвёрдай надзеі і суцяшэння для вернага Божага народа, які працягвае свой шлях, а таксама святых апосталаў Сымона і Юды, чыё свята адзначаем сёння. Мы ўсе запрошаныя прыняць маленькае зерне, якое прадстаўляе гэтая падагульняючая справаздача.

Adsumus Sancte Spiritus!

Рым, 28 кастрычніка 2023 года, свята Святых Сымона і Юды, апосталаў.

# ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ ........ 2

ЧАСТКА I — АБЛІЧЧА СІНАДАЛЬНАГА КАСЦЁЛА ........ 5

1. Сінадальнасць: вопыт і разуменне ........ 5
2. Сабраныя і пасланыя Тройцай ........ 7
3. Уваход у супольнасць веры: хрысціянскае ўтаямнічанне ........ 9
4. Убогія – пратаганісты падарожжа Касцёла ........ 10
5. Касцёл «з кожнага роду, і мовы, і племені, і народа» ........ 13
6. Усходнія Касцёлы і традыцыі Лацінскага Касцёла ........ 15
7. На шляху да еднасці хрысціян ........ 16

ЧАСТКА II — УСЕ ВУЧНІ, УСЕ МІСІЯНЕРЫ ........ 18

8. Касцёл у місіі ........ 18
9. Жанчыны ў жыцці і місіі Касцёла ........ 20
10. Манаскае жыццё і свецкія асацыяцыі і рухі: харызматычны знак ........ 22
11. Дыяканы і прэзбітэры ў сінадальным Касцёле ........ 22
12. Біскуп у касцёльнай еднасці ........ 25
13. Біскуп Рыма ў калегіі біскупаў ........ 26

ЧАСТКА III — ТКАННЕ СУВЯЗЯЎ, БУДАВАННЕ СУПОЛЬНАСЦІ ........ 29

14. Сінадальны падыход да фармацыі ........ 29
15. Касцёльнае распазнаванне і адкрытыя пытанні ........ 30
16. У напрамку Касцёла, які слухае і суправаджае ........ 32
17. Місія ў лічбавым асяроддзі ........ 34
18. Структуры для ўдзелу ........ 36
19. Групы Касцёлаў у супольнасці паўсюднага Касцёла ........ 37
20. Сінод біскупаў і касцёльныя асамблеі ........ 38

ПРАЦЯГ ПАДАРОЖЖА ........ 40

ЗМЕСТ ........ 41